© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

НАША НІВА

*Беларуская газэта* **№3, 1995**

**«ГРУПА ПЯЦЁХ».** Валянцін Рабкевіч пакінуў успаміны пра тое, як у пачатку 1970-х КГБ выкрыў у Акадэміі Навук «нацыяналістычную групу».

**ГІСТОРЫЯ ПЕРШАЯ** — пра тое, што было на самой справе. А было толькі прыватнае — учынкі, намеры, здарэньні, пра якія расказваюць дакумэнты. Потым усё гэта назавуць Эпохай, Змаганьнем за Ідэалы, Вайной і Мірам. Але гэта будзе — *другая гісторыя*, прыдуманая, пра тое, чаго на самой справе ніколі не было.

**ПРАГА.** На гэты раз — эсэ Уладзімера Арлова «Нумар зь відам на Градчаны». Зацемкі на прагамках, візытоўках, квітках і запрашальніках.

# ТРУБАЧ ВАЙНЫ



Канфлікт не пачынаецца сам па сабе, проста так. Патрэбны сыгнал і сыгнальшчык. Падумай, дзеля чаго ты сыгналіш, трубач!

Увядзеньне ў Беларусі расейскай мовы ў якасьці дзяржаўнай стане пачаткам адкрытага беларуска-расейскага супрацьстаяньня. Калі для расейскай мовы такое дзьвюхмоўе будзе толькі нязначным прырашчэньнем тэрыторыі ўплыву, то для беларускай яно стане прысудам на павольнае кананьне. Гэта зусім ня той лёс, якога мы жадаем для свае мовы. Але вярнуць цяперашняе становішча, якое далося нам мірна, можна будзе ўжо толькі праз жорсткую нацыянальную дыктатуру. Таму з хвіліны легітымацыі ў Беларусі расейскай мовы настане канец таму моўнаму лібэралізму, які існаваў у нас да апошняга дня. Расейская мова з сродка зносін і культуры аб'ектыўна ператварасцца ў палітычны сродак выцясненьня беларушчыны зь яе жыццёвае прасторы.

Кожная кніга, газэта і часопіс, радыё- і тэлеперадача, песенька ці публічны выступ на расейскай мове любога зьместу — гэта акцыя, сьвядома накіраваная на зьнішчэньне беларускага слова.

Кожная шыльда, назва вуліцы, рэклямны плякат ці транспарант, любая візуальная інфармацыя па-расейску — гэта сьвядомая акцыя ворагаў беларушчыны.

Кожны зваротак чыноўніка альбо работніка любой установы — ад мэрыі да крамы, кожны дакумант, выдадзены або запоўнены ў афіцыйным або неафіцыйным парадку па-расейску — гэта сьвядомая акцыя магільнікаў нашай мовы.

Пры ўзаконеным дзьвюхмоўі кожнае слова па-расейску можа разглядацца толькі як СЬВЯДОМАЕ АНТЫБЕЛАРУСКАЕ ДЗЕЯНЬНЕ.

Наша маладая дзяржава яшчэ занадта кволая, каб забясьпечыць выкананьне сваіх законаў. Таму ў выпадку зацьверджаньня расейскай мовы ў статусе дзяржаўнай беларуска-расейскае моўнае супрацьстаяньне непазьбежна набудзе бескампрамісны ўсеагульны грамадзянскі характар.

Мова — ахоўны знак і душа народа. Дзьвюхдушны народ — цынічны народ, пазбаўлены пэрспэктывы. «Двуязычие» — удзел зьмеяў, а не людзей.

Падумай, куды ты трубіш, трубач...

# Прадчуваньне ВРЗ

**АПАВЯДАНЬНЕ**



Барыс Пятровіч

Мазгі прамываць — гэта вам ня хіханькі-хаханькі. Гэта не стаяць бязвухім слупом на начальніцкім дыване і не лунаць на вятры паслухмяным сьцягам над статкам, што сьпяшае на дэманстрацыю сваіх вынікаў за год. Гэта — дзея, у якой галоўнае ня дзе я (ты), а калі. І пачынаецца яна звычайна яшчэ ўчора ці пазаўчора, бо заўтра можа быць (вы здагадаліся) позна. А таму ўчора Адась устаў раней, чым заўчора. Апрануў лепшае, бо адзінае паліто, не забыў пра гадзіньнік, замкнуў дзьверы на ўсе замкі, прычым на апошні — апошнім, і зьбег па сходах уніз.

На першым паверсе, ля ўзводу паштовых скрынак таптаўся срэбны (бо бяз шапкі) вэтэран і дрогкай рукою сіліўся падпаліць у скрыньцы газэту «Свабода», што выпісаў нейкі дэмакрат. Рука ня слухалася, але не зь ідэйных меркаваньняў.

— Дзень добры, — прывітаўся Адась, пазнаўшы суседа збоку, і дзядок з умольнай надзеяй вылузаў вочы на маладое пакаленьне. Аднак Адась хутчэй, чымся скеміў гэты позірк-просьбу, выскачыў за дзьверы.

Вуліца сустракала новых мінакоў тугім ветрам з дробным уедлівым сьнегам. Сьнег балюча лупіў па ілбах і шчоках і рэзка адскокваў ад іх, як ад нежывога плоту. Вуліца аж падвывала ад радасьці, назіраючы адчай чалавекаў. Але сьвяткавала яна нядоўга, бо людзі, для якіх гэтая зіма была ня першая, сходу арыентаваліся й настаўлялі на сьнег каўняры. Вуліца злавала, вецер з падвойнаю сілай шкроб і лупцаваў сьнегавою сечкай згарбацелыя ў хвілю сьпіны і гнаў людзей да прыпынку. Схіліўся пад ветрам і Адась, скамечыў твар, загарнуў яго шалікам і пачаў падаць з нагі на нагу — набліжаць да сябе прыпынак. Раптам Зямля лёгка крутнулася пад ім — ён падкаўзнуўся і аддаўся на волю коўзанкі, што панесла яго ўперад нагамі на сваёй бела-зялёнай, як замерзлыя соплі, сьпіне. Нешта недзе хруснула, шапка скарылася ветру, нясьпешна пакацілася прэч, потым, спалохаўшыся адзіноты й зьнячэўнага холаду, сьціснулася пад слупом, падрыгваючы вушамі. Адась падняўся. Галава гула, як патрывожаны звон, і матляла цела. Нехта спачувальна абтрос ягонае плячо ад сьнегу. Адась азірнуўся і ўпёрся вачыма ў нечыя, мяркуючы па гузіках грудзі. Хутчэй — жаночыя, бо ўзіраўся Адась у здвоены бугор. Так і ёсьць: пашкадавала яго двухмэтровая дзяўчына — худая і з голымі, ледзь не да Адасевых плячэй, нагамі, атуленымі кароценькай спаднічкай. У такую пякучую сьцюжу! Дзяўчына не разьвітвалася з Адасем, а пазірала на яго з маяковай вышыні прамяністым поглядам, адмовіць якому Адась ня мог. І ён забыўся на тое, куды цякло цяпер ягонае цела, забыў пра ўсе патрэбы, акрамя адной, што ўспыхнула ў ім імгненна й напружылася ў чаканьні. Кажуць, невысокія мужчыны надта любяць кахаць высокіх жанчын. Ці не таму Адась адразу скарыўся інстынкту самазахаваньня роду і, пакінуўшы няўцешна гараваць пад слупом неразлучную шапку, пайшоў за дзяўчынаю ў недалёкі, як выявілася, інтэрнатаўскі жоўта-шэры пакойчык.

Адась і дзяўчына маўчалі да самага ложку, які, дарэчы, сваім пранізьлівым скрыпам першы зламаў нерушную дзённае цішыні. Ускрыкнула і жанчына, сьціснула Адася напалам нагамі, якія заканчваліся

ВРЗ — вострае рэсьпіратарнае захворваньне, катар, насмарк і да т.п.

*Працяг на старонцы 4*

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# ЗВАРОТ ДА ПРЭЗЫДЭНТА ПАЎНОЧНА-АМЭРЫКАНСКІХ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ. ВАЮЮЧЫМ І ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДЗЯРЖАВАМ

Віншуючы ўсіх нашых супрацоўнікаў, фундатараў і чытачоў зь сьвятам Незалежнасьці, прыгадваем, што дзяржава наша, Беларуская Народная Рэспубліка, семдзесят шэсьць зь лішкам гадоў таму была акупаваная расейскімі войскамі. Прыгадваем таксама, што ладмацаваны расейскімі штыхамі й танкамі акупацыйны рэжым, пачаўшыся ў сьнежні 1918 году, трывае й да сёньня (два разы за гэты час расейскіх акупантаў зьмянялі польскія й нямецкія — ад чаго народу нашаму лягчэй не было).

Выказваючы цьвёрдую веру ў тое, што жудасным палітычным фокусам сёньняшняга галоўнага клоўна Рэспублікі Беларусі як найхутчэй настане канец, зь непазбыўнай надзеяй на перамогу Сьвятла, друкуем як разьвітаньне з смуткам адзін з самых драматычных дакумэнтаў гісторыі БНР, складзены 22 кастрычніка 1918 году — за колькі тыдняў перад крывавай навалай з Усходу. Гэты апошні крык роспачы быў праігнараваны ўсімі, да каго ён зварачаўся, што лішні раз сьведчыць пра нашу адвечную наканаванасьць — разьлічваць толькі на самых сябе. У палітычным сьвеце ў нас няма сяброў. Ёсьць ворагі й ёсьць абыякавыя. Таму паўторым сабе ўлюбёную прыказку В.Ластоўскага: «Ня вер нікому, ня бойся нікога», і будзем сьцьвярджаць сваю ўласную волю.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, складзеная з выбраньнікаў УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ, а таксама з прадстаўнікоў нацыянальных, грамадзкіх і палітычных групаў, зьяўляецца да скліканьня Беларускага Сойму адзіным Адміністрацыйным Органам, які выяўляе волю Беларускага народу й іншых народнасьцяў, што насяляюць Беларусь.

У цяжкі момант жыцьця Краю, які даверыў ёй уладу, Рада, усьведамляючы ўскладзёную на яе адказнасьць за лёс Бацькаўшчыны, зьвяртаецца да Дэмакратыяў Сьвету.

Краю нашаму, ужо спустошанаму вайною й грамадзянскай міжусобіцай, пагражае яшчэ ў выпадку адыходу Нямецкіх войскаў непазьбежнае ўварваньне анархічных элемэнтаў і абуджэньне анархічных настрояў у народных масах, а з гэтым зьнішчэньне рэштак народнага багацьця й культуры.

Зь Беларусі хваля разбурэньня пагражае перакінуцца на Захад і ўзмоцніць і там бедзтва сусьветнае вайны.

У імя культуры й чалавечнасьці, у імя пачаткаў гуманнасьці, абвешчаных спадаром Прэзыдэнтам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі просіць ўратаваць безабаронную Беларусь ад разгрому і ў гэтых мэтах зараз жа да адыходу акупацыйнага войска забясьпечыць ёй зьнешнюю недатыкальнасьць прызнаньнем Яе самастойнасьці й Незалежнасьці і ўнутраную бясьпеку передачаю ў рукі Рады Цывільнага Кіраваньня Краем.

Каб Рада магла выканаць ускладзеную на яе задачу захаваньня спакою ў Краі неабходна адначасна зь перадачаю ёй Цывільнага Кіраваньня аднавіць дзеяньне Канстытуцыйных гарантыяў публічнага й асабістага жыцьця.

Старшыня Рады Лёсік
Намесьнік Смоліч
Сакратар Крэчэўскі.

*Менск-Беларускі, 22 кастрычніка 1918 году*

Пераклад з расейскай

Цэнтральны Дзяржаўны Архіў Літвы, фонд 582, вопіс 2, адз. зах. 9, арк. 18.

# IN MEMORIAM

**Наўрад ці існуюць адзіныя
й дакладныя крытэрыі, паводле якіх
можна было б абсалютна ацаніць
аплочанасьць незалежнасьці
й дэмакратыі. Любыя сьцьверджаньні
пра аплочанасьць ці неаплочанасьць
— суб'ектыўныя й ірацыянальныя,
як ірацыянальная вера ў тое,
што адзін чалавек мог адкупіць
і адкупіў грахі сьвету.
Але, як сьведчыць гісторыя,
міталягізаваны мур мацней
за любую веду трымае й мацуе
жыцьцё нацый і людзей.**

**Гэтая публікацыя ня мае на мэце
даваць пачатак новаму міту,
каб даказваць, што цана культуры
была дастатковая. Для мяне гэта
такая самая ісьціна, няхай сабе
нават ірацыянальная й суб'ектыўная,
як уласнае існаваньне. Іншая
праблема, гэтыя аплочаныя кошты
мала вядомыя, часам, зусім забытыя
ці занядбаныя, бо па дурной
традыцыі ацэньваюцца ў чужой
сыстэме каардынат. Нават падзеі
зусім нядаўняга часу, як, напрыклад,
беларускае шасьцідзясятніцтва,
апынуліся па-за
нацыянальна-гістарычнай
сьвядомасьцю і ўспрымаюцца
як нейкая саламяная мізансцэна
правінцыйнага
спэктаклю.**

**Той факт, што ў 60-70-х гг.
у Беларусі не было масавых арыштаў
ці забойстваў зусім не азначае,
што іх не было б у іншых
акалічнасьцях. Савецкая сыстэма
ўвогуле ніколі ня мела цьвёрдых
лягічных ці этычных суадносінаў
кары й віны. Зрэшты, улада
мысьліла й ацэньвала беларускую
думку ў той самай стэрэатыпнай
агульнасаюзнай сыстэме каардынат,
таму й ня бачыла ў беларускім
дысыдэнцтве аж такой сур'ёзнай
пагрозы, як на Ўкраіне ці ў Расеі.
Цікава, што і беларускія
шасьцідзясятнікі фактычна прынялі
гэтыя ўмовы гульні, згадзіліся
з адведзеным ім
«пасадам між народамі»
і дагэтуль несьцяць свой комплекс
недастатковасьці.**

**Калі мы гутарылі ў сьнежні
1990 году з Валянцінам Рабкевічам,
я зноў адчула гэты інстынктыўны
страх адкрытага прызнаньня
сваёй рацыі, страх нацыянальнага
эгацэнтрызму.**

**У пракураным калідоры выдавецтва
«Мастацкая літаратура»
некалькі гадзін мы гаварылі
пра тыя гады, пра людзей, настроі,
ідэі, пра сфабрыкаваную КДБ
у 1973-74 гадох справу
«групы пяцёх» і пра ўдзел у гэтай
групе самога Валянціна Рабкевіча.
З тых пяці двох ужо няма:
Міколы Прашковіча, якога спачатку
правакацыйна шантажавалі, зламалі,
зганілі, а потым выкінулі гібець,
як непатрэбшчыну. П'яны, ён згарэў
у сваім ложку ў вясковым бацькавым
доме. Так, прынамсі, гаворыцца
афіцыйна. Цяпер вось
пяцідзесяцівасьмігадовы
Валянцін Рабкевіч — сэрца.
Расказаць пра тыя падзеі жыўцом
могуць цяпер толькі
Сьцяпан Міско, Алесь Каўрус
і Міхась Чарняўскі —
астатнія тры з той групы.**

Алеся Сёмуха

# Дзёньнік прыватнага чалавека



Ці павінен беларус, які жыве ў Вільні, ведаць літоўскую мову? З аднаго боку — ну, як жа, чалавек ня мусіць абмяжоўваць сябе. А з другога — ні Скарына, ні Каліноўскі, ні Багушэвіч, ні браты Луцкевічы, ні Максім Танк, жывучы ў Вільні, літоўскай мовы не вывучалі.

Калі я сказаў Н., што не адчуваю ў гэтым патрэбы, ён заўважыў, што гэта ні пра што добрае ня сьведчыць. «Ты кажаш, што літоўская мова ў Вільні табе не патрэбная, дык тое самае пра беларускую мову ў Менску табе скажа большасьць менчукоў».

Мне сорамна, але разам з тым я адчуваю й нейкую сваю рацыю і спрабую зразумець яе.

Тое, што справа дзеецца ў Вільні, і я хацеў бы, каб мая мова гучала й была зразумелая тут прынамсі нароўні зь літоўскай, — гэта з галіны лёгікі, тут усё ясна. Адкуль тады сорам?

Ёсьць у ім нешта зь піянэрскага дзяцінства. «Колькі ведаеш моваў, столькі разоў ты чалавек»... Але розных я бачыў людзей. І паліглоты бываюць паўлюдкамі. Значыць, ня ў гэтым рэч. Пакуль адзін вывучаў яшчэ адну мову, другі, напрыклад, дзе-небудзь за што-небудзь загінуў. Што да камунікацыйнай абмежаванасьці, то літоўская мова — абавязковая для кар'еры толькі ў Літве, не шырэй. А калі ты ня робіш літоўскую кар'еру?

Ясна, што ты абмяжоўваеш сябе, але хіба толькі ў гэтым? Ты з галавой сядзіш у сваім, а вакол столькі мовакультураў — латыская, эстонская, грузінская, француская... Мне ня вывучыць усіх моваў, я магу стаць спэцыялістам у адной, двух, трох, але ж і адмаўляцца ад любой зь іх я не хачу. Таму мне патрэбна толькі адна, свая мова, праз якую мне адкрыецца любая іншая культура. І гэта ўжо справа людзей спэцыфічнай прафэсіі — перакладчыкаў. Таму мой сорам — менавіта піянэрскі, а не этычны.

А вось калі б я быў літоўцам, праблема набывала б этычны характар. Гэта — пра большасьць менчукоў. Назваўся беларусам — навошта? Бо тата беларус і дзед і... У якім пакаленьні адбылася здрада?.. Яны не адчуваюць патрэбы ў беларускай мове, але й расейская не замяніла яе, ня стала сваёй, базавай, на якой яны маглі б *ствараць культуру*.

Беларуская нацыя не недасьпела, а недарусыфікавалася — вось яе стан...

— Ну, а ты? — пытаюся я ў Н. — Чаму ты літоўскую мову ня вывучыў? Дзе твой мінімум культурнага чалавека?

Маўчыць. Падшуквае *сваё* апраўданьне. «Паліглотам можаш ты ня быць», — кажа...

Так ці йнакш, а нават станоўчыя стэрэатыпы ранейшага часу разбураюцца. Прырода бярэ сваё.

///////////////////

ВКЛ... Мне ўвесь час здаецца, што Княства просіцца да жыцьця. Вялізная іржавая калёша адляжала на дне свае чыгунныя бакі. Яна зноў хоча быць Залатым Караблём, усплысьці з водаў зіхоткім эўрапейскім фрэгатам, абсыпаным зорамі.

Усе нашыя пярэчаньні, абставіны, якія «склаліся», нашыя жыцьці — мізэрныя й неапраўданыя. Божа, хіба мы... пражылі... ня ў ім?

Абрэвіятура «ВКЛ» — як скарот на выключальніку. Націсьніце кнопку, павярніце ручку, апусьціце рубільнік. Зрабіце «вкл.»! Нішто ня можа апраўдаць тое пахаваньне жыўцом, якое мы называем сваёй біяграфіяй. Хопіць чумных піроў, хопіць чужых цароў, хопіць гэтага цырку, у якім ужо даўно нікому ня сьмешна.

200 гадоў, як нехта націснуў «выкл.». 200 гадоў мы выключаныя. У выключанай краіне мы пражываем сваё выключанае жыцьцё.

///////////////////

Зянон Пазьняк чытаў па радыё свае вершы. Журналістка пыталася ў яго пра тое, што такое «хоку» і хто яшчэ ў Беларусі піша ў гэтым жанры. Яшчэ, адказаў Пазьняк, некалі ў нейкім часопісе, здаецца, у «Бярозцы», ён чытаў цудоўныя «хоку» 16-гадовага хлопца з Магілёва Андрэя Антонава, але, на жаль, далейшы лёс гэтага хлопчыка невядомы.

Ня думаю, што прафэсійны мастацтвазнаўца З.Пазьняк не дасьведчаны ў тэме, якую ўзяўся прадстаўляць. Ня думаю таксама, што прычына — у нялюбасьці да Глёбуса з Шайбаком, кожны зь якіх напісаў па кніжцы «хоку» і якія толькі й маглі надрукаваць, прычым *толькі* ў сваёй «Бярозцы», японскія вершы хлопчыка з Магілёва. Прычына ў іншым — у партыйнасьці літаратуры. Зянон Пазьняк выступае зусім у стылі сацрэалістаў з Фрунзэ-5. Тое, што не ўкладаецца ва ўяўленьні лідэра БНФ — проста не існуе. У выніку замест прадстаўленьня жанру атрымліваецца адно дэманстрацыя сябе.

Між тым, можна сабе ўявіць, колькі павінна было прагучаць цікавых для шырокага слухача фактаў, прыкладаў, а таксама імёнаў. Сёньня можна гаварыць пра цэлую школу «хоку» ў сучаснай беларускай літаратуры. Прычым гэта якраз той жанр, які пабуджае ўсё новых людзей узяцца за пяро і ўпершыню вывесьці на паперы беларускае слова.

Прыватны выпадак з Пазьняковым інтэрвію адразу выглядае непрыватна, калі бачыць за сьпінаю паэта цэлую кагорту сучасных адраджэнцаў і тыя тэндэнцыі, якія яны праводзяць у жыцьцё. Змагаючыся за «адраджэньне нацыянальнай культуры», гэтыя людзі самі Культуру не ствараюць. Яны пішуць вершы, карціны, але ня дбаюць пра беларускае культурнае поле, якое мусіць урэшце разрасьціся да належных памераў, увабраўшы ў сябе ўсё, што «шаволіцца» па-беларуску ў несавецкім кірунку. Аднак замест гэтага ў адраджэнцаў атрымліваецца іншы вынік — паміж афіцыёзам і «нефармаламі» зьяўляецца яшчэ адна каставая ці партыйная культура — бэнэфаўская. Яна найперш бэнэфаўская, а пасьля ўжо беларуская. Напачатку БНФ аб'яднаў у сваіх шэрагах усіх беларускіх творцаў, якія па-над ідэалёгіяй ставілі эстэтыку. Але так было толькі напачатку.

І зусім невыпадкова для Пазьняка «прапаў бязь вестак» Андрэй Антонаў, які ў 16 гадоў бэнэфіў у Магілёве, а сёньня працуе ў віленскай «НН».



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# «ГРУПА ПЯЦЁХ»

*Успаміны Валянціна Рабкевіча*



Летась увосені па беларускім тэлебачаньні была перадача, здаецца, «Пазыцыя». Туды былі запрошаныя розныя людзі, адзін зь іх — дырэктар Інстытуту мовазнаўства Падлужны Аляксандар. На пытаньне аб папярэдніках БНФ ён зазначыў, што такі невялікі рух пачаўся ў БДУ ў 1971 годзе. Гэта сапраўды так было. Зь імі тады вельмі лёгка расправіліся, паставілі некаторым двойкі, павыключалі. Студэнты пасьля паперапаводзіліся хто ў Брэсцкі, хто ў Гомельскі ВНУ. Сярод гэтых людзей былі Алесь Разанаў, Вольга Іпатава, іншыя. Што яны рабілі? Хадзілі па аўдыторыях, вельмі дэмакратычна складалі сьпісы тых, хто хацеў, каб выкладаньне вялося па-беларуску. За гэта іх і разбамбілі.

А нас пачалі цягаць у 1973 годзе. Тады разгледзелі гэтую так званую групу. Менавіта групу, а не арганізацыю. Гэта ўсё тыя ж сталінскія мэтады, ім важны быў сам факт, паказаць, што нешта ёсьць, але ня дужа буйное. Яны хацелі звузіць, нібы ліквідаваць у пачатку...

Першая хваля — калі пачалі цягаць людзей. А там такая сыстэма, што ня будзеш нікому нічога расказваць, аб гэтым падпісваеш паперку. А там яны ўжываюць розныя мэтады: шальмаваньне, запалохваньне...

Яны інкрымінавалі тое, што пачынаецца нацыяналістычны рух... У КДБ тады выклікалі многіх. І КДБ мела прынамсі тры сьпісы, некалькі варыянтаў, па якіх была задума аддаць на расправу. Па адным сьпісе было недзе чалавек за семдзесят, па другім дваццаць, а па трэцім пяць. На гэтым варыянце яны й спыніліся. Вырашылі зрабіць расправу-мінімум. Але людзей там перабывала багата. Хоць яшчэ раз паўтараю, ніякай групы не было. Былі можа думкі, меркаваньні — тое, што зараз гаворыцца адкрыта, і што тады гаварылі пры сустрэчах, на сяброўскіх зборках, на вечарынках пад чарку...

Мікола Прашковіч ведаў пра ўкраінскі рух, ведаў, каго там узялі, ён нават праводзіў зборы грошай, якія дасылаў на дапамогу ўкраінцам. Моцную сувязь трымаў з украінцам Піўтараком — гэта мовазнавец, зараз дзесьці ў Кіеве. У абвінаваўчым акце пра ўсё гэта шырока гаворыцца, гэта фігуравала і ў справе. Блізка з Прашковічам сябравалі Барадулін, Караткевіч ды многія іншыя. Ён быў такі чалавек, які лічыў, што кожны, хто гаворыць па-беларуску — добры чалавек і зь ім можна йсьці да канца...

Дык вось, што я казаў пра дырэктара Інстытуту мовазнаўства. Яму на перадачы было зададзена пытаньне: ці на голым месцы пачаўся сёньняшні рух (БНФ — заўв. А.С.)? Ён адказвае, што не на голым, што такое ўжо было ва ўнівэрсытэце — жаданьне абараніць сваю мову і г.д. Ну а больш шырока было ў 1973 годзе ў Акадэміі навук, калі выступілі навукоўцы.

Але дзе яны выступілі? Ніхто ім ня даў выступіць! А далей быў яшчэ адзін штрых. Журналіст задае наступнае пытаньне: «А ці каралі іх?» «Ды не, — кажа Падлужны, — не каралі, проста памянялі працу»...

А кары былі. З нас пяцёх два былі члены партыі. Гэта я і Сьцяпан Міско. Мяне выключылі. Міско таксама, але ён дамогся, каб потым яго Масква аднавіла. Я дайшоў быў да райкаму партыі, але паглядзеў што там навешваюць розныя ярлыкі, і я спыніў. А вы, напэўна, ведаеце, што значыць уладкавацца, калі ты выключаны з партыі. Толькі й заставалася, што пайсьці капаць ямы, як, напрыклад, Сьцяпан Міско. Пасьля гэтага ён 13 гадоў (яшчэ два гады таму) працаваў, будучы кандыдатам навук, у Кніжнай палаце, перапісваў карткі за 80 рублёў. Калі яго звольнілі з Акадэміі навук, толькі гэтую працу й далі.

Першыя сыгналы аб нацыяналістах паступілі ў Маскву ад нашых мясцовых ворганаў, маўляў, такое дзеецца, але нічога з гэтым ня робіцца ў рэспубліцы, меры не прымаюцца. Дайшло да Машэрава, ды затухла. Гэта быў верасень 1973 году. А з новага году пайшло зноў ды такімі хуткімі тэмпамі. Кажуць, з Масквы прыехаў Шавура (быў калісь загадчыкам аддзелу культуры ЦК у Маскве, сам зь Беларусі). Ня ведаю, ён ці ня ён, але нібыта была прывезеная такая папера, скарга, і, нібыта, Машэраў наклаў рэзалюцыю «Если подтвердится, помочь трудоустроиться». Ну, тут прыцэл ужо ясны, маўляў, даць у косьць, але не забіваць. «Если подтвердится...» — ну, зразумела, што пацьвердзіцца. І вось у 1974 годзе яны якраз гэтую апэрацыю й выканалі.

Якія былі пакараньні? Двох, як я казаў, выключылі з партыі... Астатніх усіх пазвальнялі з працы. Міколу Прашковіча яны ўвогуле ганялі! Ён у нейкім рабочым інтэрнаце ў бібліятэцы працаваў. Там, можа, дзьве паліцы кніжак, ды ён бібліятэкарам прыстаўлены на рублёў 70. Ні грошай не было, нічога. Ён купляў капыты і варыў іх... Здаецца, працаваў у краме на Каліноўскага, мяса рубаў. Адным словам, яны яго маральна прыдушылі, ён ня вытрымаў. Яму было вельмі цяжка. Падтрымкі ён ня мог ніякай атрымаць ні адтуль, ні адкуль, бо, відаць, нагаварыў многа...

Ніякага шырокага працэсу не было. Яны наўмысна зрабілі гэтую групу. Гэта ж дае аўтарытэт іхняму ведамству, званьні, павышэньні. А калі такія самыя працэсы ёсьць на Ўкраіне, значыць і ў нас павінны быць. І калі «пресечь» своечасова, дык гэта дзяржавай будзе аплочана. Хоць, натуральна, і стукачы ў гэтай справе былі...

Я добра ведаю Алеся Каўруса яшчэ зь інстытуту. Ужо 40 гадоў мы зь ім знаёмыя і не адмаўляемся адзін ад аднаго, і думкі нашыя не разыходзяцца. У гэтай справе мы таксама былі разам... Яго пасьля звольнілі з Інстытуту мовазнаўства.

Якія пытаньні былі на допытах? Многа пытаньняў. Напрыклад, што такое дзядзькаваньне і як вы да яго ставіцеся? Якія ў вас адносіны з Караткевічам? Хто напісаў «Лысую гару»? А што вы можаце сказаць пра нейкага там чалавека з Гомеля з пэдінстытуту? Ці ведаеце вы Барадуліна? А які ён? Ну і так па ўсёй Беларусі.

Я быў у БелСЭ загадчыкам рэдакцыі літаратуры, мовы, фальклёру і этнаграфіі і таму меў рабочую сувязь з усімі. Пыталіся і пра Ліса, і пра Гілевіча, і іншых. Пыталіся, між іншым, і аб тым, як аднойчы мы з Каўрусам нібы разьмяркоўвалі пасады ў Беларускім Урадзе. Ня памятаю, ці было такое, можа калісь жартам і было. На допытах яшчэ было пытаньне: «Вы казалі, што ў рэспубліцы праводзіцца русыфікацыя?» Я ім сказаў: «Канечне, праводзіцца». На гэтым была пастаўлена кропка. Яны, здаецца, былі задаволеныя...

Нягледзячы на тое, што ў наш час размовы зь людзьмі, калегамі на працы былі вельмі асьцярожныя, штосьці ўсё ж такі да іх даходзіла. Я нават успамінаў некаторыя свае размовы. Напрыклад, на нейкім сходзе ў інстытуце я, ужо будучы выпускніком, рэзка выступаў па нацыянальным пытаньні. Гэта было дзесьці ў 1964 годзе. У КДБ гэта ўсё, як высьветлілася, зафіксавалі. І ў 1973 г. мяне пра гэта пыталі. Мне нагадалі, што я казаў аб тым, што трэба паступаць у партыю, каб у партыі было больш нашых людзей. Я нават успомніў тады, хто мог гэта перадаць. Гэты чалавек і цяпер належыць да творчай інтэлігенцыі, і сягоньня ён таксама стукач...

Я ня скончыў, ці каралі каго?.. Я, як выключаны з партыі, нідзе не атрымаў працы. Хадзіў на біржу працы, зарэгістраваўся там. Каўрус быў беспартыйны. Яго таксама нідзе не ўзялі. Міша Чарняўскі пайшоў недзе стэнды маляваць. Трохі пазьней, відаць, там наверсе вырашылі мне й Каўрусу даць работу. Я пайшоў у прыёмную да Кузьміна, — гэта быў сакратар ЦК па ідэалягічнай працы, — і ён мне сказаў у прысутнасьці Дубянецкага (я тады яшчэ ня ведаў, што гэта Дубянецкі): «Мы решили, я один такие вопросы не решаю, с Петром Мироновичем оставить вас в сфере идеологической работы. Вас и Кавруса».

Дубянецкі тады інструктарам ЦК быў, яго выклікалі, каб забраць мяне пад рукі, як здохлага, ды недзе некаму аддаць. Размова цягнулася хвілін з трыццаць, пасьля пайшлі да Дубянецкага. Ён пазваніў да Дзяльца й сказаў таму, што ў яго прысутнасьці была размова з Кузьміным уладкаваць мяне ў «Мастацкую літаратуру». Хоць такой гаворкі й не было, проста Дубянецкі хацеў памагчы. Ён так і сказаў: «Я ж не хачу, каб цябе запёрлі кудысьці ва «Ўраджай», трэба ж нешта людзкае...» Так вось мяне ўладкавалі пасьля шасьці месяцаў бяз працы.

Спачатку працаваў я рэдактарам, пасьля яшчэ 5 гадоў выконваючым абавязкі загадчыка рэдакцыі. Загадчыка так і не далі. Парторг выдавецтва, пісьменьнік Хведар Жычка, увесь час званіў у ЦК, маўляў, абавязкі выконвае чалавек, якога выключылі з партыі. Праўда Жычка сам быў з штрафнога батальёну — яго прагналі зь «ЛіМу».

**З партыі выключалі мяне экстранна. У адзін дзень было і партбюро, і партсход. Дырэктарам БелСЭ тады быў Пятрусь Броўка. Пачалі чытаць абвінаваўчы акт. А там усё болей пра Прашковіча, што абзываў рускіх маскалямі, што ўкраінцам грошы дасылаў і г.д. Парторгам быў Радзюк. Яго за нешта выкінулі з памочнікаў у Саўміне, дык прыслалі да нас у рэдакцыю загадчыкам. Філёзаф быў па адукацыі. Ён і зачытваў абвінавачваньне. Выступалі і іншыя. Гаварылі рознае, хто добрае, хто благое. Узяў слова Васіль Хаўратовіч, зараз ён намесьнік рэдактара БелСЭ. Добры мужык, добра я быў зь ім знаёмы. Прыкідваецца таксама шчырым беларусам. Ну, вось і кажа ён: «Ах, што ж ты нарабіў? Добры ж хлопец быў. Сорамна будзе некалі сустрэцца». І праўда, цяпер, спаткаўшы яго, я б яму сказаў, што сапраўды сорамна, як ты і казаў.**

**Сёе-тое і Броўка сказаў. Ён гаварыў па-беларуску: «Хоць бы і хацеў зрабіць Рабкевіч у БелСЭ штосьць нацыяналістычнае, дык бы ня выйшла, бо мы тут». А пасьля ў гаркаме партыі гэта перафармулявалі па-расейску: «Хотя и хотел...» Спачатку мне прышылі фармулёўку «за няправільнае разуменьне ленінскай нацыянальнай палітыкі», але за такое ж не выключаюць з партыі, а перавыхоўваюць. Тады перакруцілі й атрымалася «за нацыяналістычнае разуменьне ленінскай нацыянальнай палітыкі». Мясцкам і парткам усё зацьвердзілі й звольнілі мяне па артыкуле 34 Б — «скасаваньне працоўнага дагавору па ініцыятыве адміністрацыі». З тымі пяцьцю зь іншых інстытутаў прыкладна так, як і са мной усё было арганізавана.**



Па Беларусі, дарэчы, шум быў, што ў Акадэміі навук групу выкрылі. Казалі, што многа зброі забралі, што група паўстаньне рыхтавала. Што нават былі разьмеркаваныя будучыя «партфэлі» сярод змоўшчыкаў. Што ж да нацыяналістычнага руху, каб гуртавацца неяк, дык такой магчымасьці не было. Ідэі толькі яшчэ зьявіліся. Зьбіраліся разам на бяседы, гаварылі пра Янку Купалу, пра «Тутэйшых», пра Забэйду... Гэта толькі пачатак 60-х. Нейкае групаваньне ўжо пачалося, калі пачалі заціраць Быкава, у канцы 60-х. Яшчэ будучы асьпірантамі мы «Мёртвым не баліць» чыталі запоем. Чытаў я рукапіс «Каласы пад сярпом тваім» Караткевіча! Вы яго ніколі не прачытаеце такім — у тры разы большыя былі «Каласы...» Карацей, ужо была ідэя, якая яднала нас. А рознага роду рэпрэсіі ворганаў былі заўжды, але яны ўсё зьвязвалі з крыміналам. Вядома, што ў 1968 годзе забілі Лявона Баразну. Вось каго перасьледавалі, дык гэта Пазьняка.

Дарэчы, забыўся, якраз з 1972 ці 73-га году пачалі «хадзіць прывіды нацыяналізму» на Беларусі. У БелСЭ намесьнікам Броўкі працаваў яшчэ адзін філёзаф — Пётр Пузікаў. Ён быў вельмі прарускі настроены, нават хацеў пакінуць у філязофіі словы «язык», «мысль»... Калі ён выказваў гэтыя свае думкі, дык Янку Скрыгану (ён быў загадчыкам рэдакцыі) гэта было, як нажом у адно месца. І вось неяк забракавалі пераклад рукапісу БелСЭ. Моўны выклад быў на ўзроўні сёньняшняга «Вячэрняга Мінску», а можа й горшы. І вось адзін раз намесьнік галоўнага рэдактара БелСЭ Казека (ён жа потым езьдзіў у КДБ браць маю справу) і Петрашкевіч, ён быў адказным сакратаром, мне й кажуць, што Скрыган з турмы выйшаў, але нацыяналізмам пахне. Трэба яго неяк прыбраць, а мяне на яго месца. Петрашкевіч яшчэ казаў мне: «Мы гэта вельмі хораша зробім». Тады я дамовіўся з Броўкам, што ўсю моўную работу сам зраблю, але каб Скрыган застаўся на сваім месцы. Так і зладзілі: за мной мова, за ім — ідэалёгія. Складаныя тэрміны праводзілі праз Тэрміналягічную камісію на чале з Крапівой. Там жа быў і Глебка. Часам праз Глебку нам удавалася багата правесьці.

**Былі розныя сутычкі. Аднойчы я бачыў канфлікт Содаля з Суднікам. Содаль сказаў Судніку, які сядзеў у Прэзыдыюме: «Вось вы — дырэктар Інстытуту мовазнаўства, але ж па-беларуску двух слоў ня зьвяжаце». І гэта пры вялікай аўдыторыі, дзе сядзелі студэнты, выпускнікі, выкладчыкі. Ён меў рацыю. Мовай займаліся людзі, якія яе ня ведалі. Яны ж прыдумалі тэрмін «янкоўшчына». А Янкоўскага нават не абралі членам-карэспандэнтам. Падлужны — такі самы. Вось яны й напісалі сваю рэцэнзію ў ЦК. Пісалі там аб нейкіх нацыяналістычных памылках у мове. Цікава было б яе зараз пачытаць.**

Быў яшчэ такі чалавек Зайцаў. Ён чытаў некалі лекцыі па рэлігіі, сусьвеце, літаратуры ў будынку на Энгельса. Я ведаю, што яго таксама, як і нас, звольнілі з Інстытуту літаратуры, хоць у нашай так званай «пяцёрцы» ён ня быў. Калі разьбіралі Прашковіча, што памагаў украінцам, дык Зайцаў сказаў, што тут нічога благога няма, і што ён таксама даў бы грошы. Здаецца, гэты ж Зайцаў, калі служыў у войску, выконваў нейкае заданьне КДБ. Расказваў, што нейкіх людзей кідалі ў варонку зь ледзяной вадой. Тыя чапляліся за краі, а салдаты білі іх сваімі ботамі па руках. Ён сказаў тады прысутным, што мае права сказаць слова ў абарону так званых дысыдэнтаў, бо ведае, што такое КДБ. За гэта яго й звольнілі...

*1990 г.*



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010





*Здымак Дзяніса Раманюка*

# Андрэй Антонаў

Ля калодзежа калюга
Крывавая. Тут бабця
клубніцы мыла.

Згубіў старую
Люльку. І не ўзгадаю,
Ці плакаў дзіцёнкам?

Ты сыходзіш — ідзі.
Адно не пакідай пальчаткі
У вітальні.

Возера — гладкае
Шкло. Мо гладыш мне ў
Ваду шпурнуць?

Ноч. Сьнег у твар.
Цяжкія крокі ў сьпіну.
Страх азірнуцца.

Зноўку восень. У
Размовах дождж
Праз слова.

Як мала табе
Было трэба. У кубак з гарбатаю
Кіпень падліваю.

Гастру аловак.
Узгадаў, што марыў
Стаць касманаўтам.

# Прадчуваньне ВРЗ

*Працяг з старонкі 1*

недзе высока-высока, і ён канчаткова забыўся пра ўчора і пазаўчора, пра свае клопаты наперадзе, хоць яны й ня хіханькі-хаханькі, забыўся дзе ён, хто ён і захапіўся дзеяй, галоўнай гераіняй якой была двухмэтровая дзяўчына, што зрабілася жанчынай, натыкнуўшыся (у сэнсе — спаткаўшы) на яго. На ўсё воля лёсу, думаў Адась, і стараўся толькі, каб дзея рухалася эфэктыўна, бадзёра, з максымальнамінімальнымі перапынкамі паміж.

Мінуў дзень, у які Адась выскачыў з дому, каб падкаўзнуцца пад нахабным ветрам і быць пашкадаваным двухмэтроваю дзяўчынаю; мінула ноч, запомненая толькі хістаньнем ценяў на падлозе: то вулічны ліхтар-бессаромнік падглядваў у вакно. Нічога, абы не фатаграфаваў для часопіса пра AIDS ад выпадковых сувязяў. Пачаўся сонцам новы дзень... Ды бегаў і бегаў па пакоі нястомны ложак з стаптанай у кроў прасьцінаю, падлога спружыніла ўсьлед целам і цаляла ў такт, дрыжала шклянка на стале і няўмольна пасоўвалася пад Адасевым роспачным позіркам да краю, каб урэшце пад вечар упасьці й жалобна пырснуць непатрэбнымі шклінкамі па пакоі. «А я хацела папіць зь яе гарбаты...» — сказала двухмэтровая жанчына прыгожым дзявочым голасам і то былі першыя за мінулы час ейныя словы. Адась узрадаваўся, бо даўно сьвярбела ў ім думка, што трапілася яму нямая дзяўчына. Жанчына заўважыла ягоную ўсьмешку — знак паразуменьня — і таксама расьцвіла (ці не з тае ж прычыны, бо і Адась дагэтуль ні слова не прамовіў).

Шклянка і сапраўды была сіратою ў гэтым пакоі, і гарбата пілася з носіка імбрычка па чарзе. Перш чымся піць, жанчына сьмяшыла Адася ўмелым казытаньнем носіка імбрычка языком і губамі (адкуль і ўзялося тое ўменьне: інстынкт, дый годзе). Калі ж яна выпрасталася ва ўвесь свой рост і пранесла голае самае важнае на вышыні Адасевай галавы, яму ўпершыню стала брыдка. Яму захацелася скарыстанай, скамечанай паперкай адкаціцца куды-небудзь у куток, далей ад гэтай назойлівай кучаравасьці. Яму падумалася раптам, што не жыцьцё галоўнае на гэтай зямлі, а сьмерць, і чым раней завалодаеш ёю, тым лепш. Спакойна-абыякава, сыта падумалася і гэтаксама спакойна прынялося падуманае — галавою, сэрцам і душою. Адась узяў нож, што перад тым уваходзіў у масла, як у масла, і быў яшчэ сьлізкі, і падыйшоў да ложку з жанчынаю. «Глядзі!» — сказаў ён і наскрозь пракалоў нажом руку. Нож сам вісеў у руцэ і капаў на падлогу крывёю, а жанчына маўчала, як не жывая. Толькі грудзі ейныя часьцей задыхалі ўніз-уверх, уніз-уверх ды распухлыя вусны пачалі павольна, замаруджана крывіцца ва ўсьмешку. Брыдкую, трэба сказаць, усьмешку. Непрыгожую. А ў чалавека ўсё павінна быць...

І тады Адась аперазаў хусьцінкаю руку, накінуў на плечы паліто, паклаў у кішэню гадзіньнік і выйшаў на лагодна-адліжную з новага ранку вуліцу.

Вуліца плакала дахамі, радавалася Адасю і пяшчотна сьцялілася яму пад ногі, як самая верная жонка. Адась пазнаў вуліцу: ён любіў яе дрэвы і дамы і часта прыходзіў сюды, каб пасумаваць у адзіноце. Яму прыемна было ісьці паўз лаўкі, на якіх сядзелі вечныя бабулькі, і слухаць, як яны перамаўляюцца: «Ты хварэла?», «Не, да дачкі ў Менск езьдзіла. Увесь акцяб, наяб і дзякаб у яе пражыла...»

Дом Адасеў быў блізка адсюль, і ён крочыў да яго нясьпешна і вольна між людзей, якім ён ня быў патрэбны цяперака і быў патрэбны. «Купі матрошку, — папрасіў Адася студэнт у акулярах-роварах — акурат Раскольнікаў са школьнага малюнка, — купі ордэн Леніна, — папрасіў ён зноў, калі Адась запаволіў крок, а потым: — купі хоць жаўнерскі пас з цэшкай-зоркаю — афіцэрскі...»

Студэнт спыніў Адася — і гэта ўжо нямала, ён прымусіў Адася задумацца: купіць — не купіць, і гэта яшчэ больш, ён верыў, што ў Адася ёсьць грошы на тое, каб набыць... Ці ведаў, а ня верыў? Адкуль ведаў? «Хто ты, студэнт?» «Я з мэдыцынскага...», «Я не пытаю адкуль, я пытаю — хто ты?», «Студэнт», «Ты дурны ці прыкідваесься: я пытаю — хто ты?», «Па анкеце, пашпарце, ці наогул?», «Наогул», «Наогул я чалавек, гомо сапіенс, атрад прыматаў, рудымэнтаў у выглядзе хваста і рожак ня маю... Таму й прадаю, а не купляю», «І што ты хочаш за матрошку-Лукашэнку?», «Душу. Тваю душу. Матрошка гэтая дорага каштуе. Вазьмі лепш Кебіча. Задарма. Ці Шушкевіча. За бакс...», «А ёсьць Пазьняк?», «Усе пытаюць, ды — няма», «Тады бяры вось бакс».

Двума пальцамі, за галаву, Адась узяў матрошку, панёс яе дзясятак мэтраў і паставіў тулавам бяз ног у сьнег: мо каму спатрэбіцца, падыме, парадуецца ўдачы, а яму бакса не шкада — студэнтам трэба жыць таксама. Пакінуў матрошку і нібы адліплі лёзунгі ад падэшваў, ногі панесьлі лёгка, быццам у сьне, панесьлі наперад, да канца. Пакуль што вуліцы. Адліжнае вуліцы, на якой ужо пачалі зьбірацца ў чароды першыя веснавыя лужыны. Самыя гаспадарлівыя з задавальненьнем заўважаюць іх і прыгадваюць пра лецішчы, пра скрынкі для расады, пра памідоры, перцы й агуркі гатунку «Нежынскі»...

Адась вярнуўся дамоў, зьняў мокрыя боты, разьлёгся на ложку й прамармытаў: «Благодать! Лепота!» Чаму па-расейску? Бо ня ведаў ён ні нямецкае, ні гішпанскае, ні ангельскае, ні нейкіх іншых самых распаўсюджаных, альбо забытых усімі, акрамя навукоўцаў, моваў, а сваёй яму цяперака не хапала. Пакуль ён мармытаў, да яго прыйшлі госьці. Дзьве дзяўчыны й сябар. «Зграбненькая...» — нехаця падумаў Адась пра тую, што была зьлева. Сябар замітусіўся каля стала. Сумная рэч жыцьцё, занудлівая й заштампаваная. Пасьля гарэлкі быў нягеглы сорам, ламаньне ці ўломваньне, прычым Адась уяўляў сябе пеўнем з показкі (памятаеце — не здагаю, дык пагрэюся), потым — розныя пакоі, абмен, чарганьне і чортведамашто да самае раніцы. А раніцай — безвыніковы сум пра страчаны вечар, зьнявечаную ноч, пакінутае там здароўе... І пытаньне без адказу, якое ніколі не прыходзіць да жарсьці, а заўсёды пасьля: навошта?

У рэстарацыі, куды згаладнелы Адась прыплёўся палуднаваць, давалі ўсё ўчорашняе, але чакаць яго даводзілася ня менш за гадзіну. Адась глядзеў на стоць, няроўна засмаленую цыгарэтным дымам, на высокія вокны з напаловубруднымі шторамі, нібы карысталіся імі, як сурвэткамі, на мокрыя, голыя дрэвы ўдалечыні. Потым падрамаў...

Прачнуўся ён, калі афіцыянтка пасадзіла за ягоны столік дзьвюх дзяўчын, з выгляду — прыежджых. Дзяўчыны ціха загутарвалі чаканьне. І Адась вымушаны быў слухаць іх, ня ловячы сэнсу, а толькі раз-пораз уздрыгваючы ад хвосткіх тугіх словаў, што зусім не адпавядалі зьнешняй цноце й правінцыйнасьці дзяўчат. Шэпт гушчэў, і Адась хоць ня хоць пачаў унікаць у соль размовы, яму непатрэбнай. З гутаркі выходзіла, што менавіта гэтыя дзяўчаты начавалі сёньня ў Адася. Ён прыгледзеўся: не, за тую пару гадзінаў, што мінулі ад разьвітаньня, яны гэтак зьмяніцца не маглі. Па-першае, падрасьці. Па-другое, схуднець. Усё астатняе зьмяніць можна было. Калізія падслуханага вечара й ночы супадала з тым, што перажыў Адась (чортведамаштодараніцыбезьперапынку) і супадала цалкам. Аж да падрабязнасьцяў: «Ён, г...к, казаў, ё... яго маць, што ранкам, бл..., пакорміць, — шаптала «зграбненькая», — а сам, бл..., зьнік не разьвітаўшыся...» І праўда, Адасеў сябар зьбег на сьвітанку ледзь чутны скрозь сон і дзяўчаты сыходзілі потым з кватэры нечым заўважна незадаволеныя. Але чым — Адасю не сказалі.

Жыцьцё любіць паўтарацца. Нават у адзін той жа дзень і той жа час — супакойваў сябе Адась, слухаючы мацюкі дзяўчат і пазнаючы іх саміх. Ён не пазнаў бы іх, пэўна, і голымі, настолькі яны былі непадобныя да сябе начных і ранішніх. Не пазнавалі й яны Адася, як бы між іншым кідаючы на яго празрыстыя позіркі. Адась рабіў выгляд, што нічога не разумее, што сумуе, што стомлены жыцьцём і чакае ад яго цяпер толькі добрага харчо, шніцэля з гарнірам і сто сьмятаны (комплексны абед нумар адзін). Але яны (дзяўчаты й Адась) былі маладыя, яны сядзелі за адным сталом — і пераадолець гэтыя недахопы існаваньня сілаў не ставала. Яны напаўвока ацэньвалі адно аднога (Адась, самі разумееце, адзін — дзьвюх), на прадмет магчымых кантактаў і ня менш, чым «дружбы» у пэрспэктыве. І ўрэшце Адась падумаў: а чаму б мне сёньня не паўтарыць сюрпрыз у адваротным парадку — узяць ды й заваліцца да сябра зь дзьвума цёлкамі ня горшымі за ўчорашніх? Дзяўчаты, быццам адчулі перамены ў Адасю, ягоныя ваганьні, і адна папрасіла запаліць. Адась дастаў цыгарэты, запальнічку. Дзяўчына перагнулася да яго праз стол, падсунулася да самага ягонага твару, і прыпаленыя вокісам валасы казытліва аблашчылі ягоныя рукі, як не загарэліся ад высокага полымя. Дзяўчына выпраменьвала юр, жарсьць і нешта яшчэ, што межавала зь бясконцым аргазмам. Калі б быў цяпер вечар, Адась запрасіў бы яе на дамскі танец, каб адчуць, як млее, растае, цячэ яна ад дотыкаў, п'янее й правальваецца ў апраметную, калі цела знаходзіць цела. Галоўнае, гэта сьведчыла, што была яна нармальнаю, здаровае — сьвядомаю — жанчынаю, а ня скончанаю лесьбіянкаю. «У мяне ёсьць ся...» — пачаў Адась, доўга прыпальваючы цыгарэту й ловячы блізкае дыханьне дзяўчыны, аднак прыгадаў свае ранішнія думкі пра страчаны вечар, неадпачнутую ноч, і замоўк на паўслове. Дзяўчаты глыбока зазіралі яму ў вочы, нібы падахвочвалі да наступных словаў, і Адась не стрымаўся, дагаварыў: «...бар, якому ўрачы прапісалі спаць з жанчынаю, каб супакоіць нэрвы. Але ён нежанаты, і штовечар узьнікае праблема...», «Абажаю аўганцаў, — сказала «зграбненькая», — пазнаёміш? Я яму паспагадаю», «Ён не аўганец. Ён проста хворы. У яго прыяпізм...» «А-а, хворы... — расчаравана прамовіла «зграбненькая», але тут жа выправілася: — Нічога, я й хворых шкадую...»

Комплекснага абеду нумар адзін яны так і не дачакаліся. У бліжэйшым гастраноме Адась набыў бохан «Русского», дзьве пляшкі «Русской», яшчэ чагосьці інтэрнацыянальнага з закусі і сьмялей на Сусаніна павёў дзяўчат да сябра, які, Адась ведаў, мірна адсыпаўся цяпер у сябе дома і ў страшным сьне ня сьніў ніякіх сюрпрызаў.

Гісторыя паўтарылася. Аж да таго, што ранкам Адась зьбег дамоў без разьвітальных пацалункаў і сяброўскіх абдымкаў. Але й дома ён ня выседзеў. Ізноў галава, як і ўчора, як і заўчора, прасілася на вуліцу, на ненагрэтае батарэямі сьвежае паветра. Як сабака просіцца ў гаспадара па патрэбе. А гэта вам — ня хіханькі-хаханькі... Адась апрануў паліто, прыгадаў забыты ў кішэні гадзіньнік і выйшаў у засьмечаны брудным адліжным сьнегам двор. Дзеля працэсу, дзеля дзеі... «Сумная рэч — жыцьцё, І чым падрабязьней яно ў цябе — тым сумней», — падумаў ён, настаўляючы каўнер, і высмаркаўся.



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



**Што такое праўда гісторыі? Францускам рэвалюцыя і Другая сусьветная вайна — толькі міты, умоўнасьці, прыдумкі, тое, чаго на самой справе ніколі не было. Марата забілі — было, Сотнікава павесілі — таксама было на самой справе. А ідэю, за якую яны загінулі, прыдумалі пасьля. Прычым забілі іх аднойчы, а ідэя, за якую пралілася іхняя кроў, ужо ня раз зьмянялася і яшчэ будзе зьмяняцца.**

**Людзі ствараюць пэўныя ўмоўнасьці, каб можна было ўсталяваць пэўны парадак рэчаў. Таму гісторыя дзяржавы можа зусім не адпавядаць таму, што адбылося калісьці ў рэальнасьці. Беларускі хлопчык Паўлік Марозаў быў героем, пасьля — антыгероем, а на самой справе ўсё зусім інакш, нашмат больш складана, «як у жыцьці».**

**Постмадэрнізм паставіў пад сумнеў ісьціну ў гісторыі. Праўда ёсьць, а ісьціна — міт, творчасьць, інтэрпрэтацыя. І беручыся расказваць гісторыю, важна іх ня блытаць.**

**Праўда — гэта «гісторыя пра нашага Грыгорыя», яна заўсёды прыватная, канкрэтная, нічыя. А ісьціна — Каралядворскі рукапіс, Слова пра паход Ігара, гісторыя Беларусі, — яна агульная, нацыянальная, свая і чужая. Пра «Грыгорыя» ўсё сказана ў актавых кнігах, і наша задача тут — ня схлусіць. А пра Беларусь галоўнае — напісаць прыгожа й захапляльна.**

**Што нашыя людзі лепш ведаюць нешта з гісторыі Расеі або Францыі — зусім не ад бяднейшасьці беларускай мінуўшчыны на факты. Бо справа ня ў фактах, а ў творчым патэнцыяле гісторыкаў, якія ствараюць міты.**

**Сёньня мы пачынаем друкаваць у «НН» актавую гісторыю Беларусі, гісторыю штодзённасьці, г. зн. тое, што было на самой справе. Першая тэма — вясельле.**



# ВЯСЕЛЬЛЕ

Вольга Бабкова

*Усялякі час пакідае пасьля сябе значна больш сьлядоў сваіх пакутаў, чым свайго шчасьця.*

Е.Хейзінга

Адной з значных падзеяў у прыватным жыцьці сярэднявечных людзей было вясельле («веселе», «свадба», «венец», «шлюб»). Вось калі выкладаліся значныя грошы на пачастункі й пітво гасьцям, заключаліся дамовы паміж двума бакамі, апраналіся найлепшыя строі... У перадсьвяточную карусэльную віхуру ўцягвалася безьліч людзей: сваты, бацькі, маткі, дзяды, дзеверы, швагры, браты, сёстры, родныя й стрыечныя, цешчы, цесьці, «сестрынцы», «братанки», падчаркі, «тетухны», «детины», «робяты малые», карацей, «уси мужы, братя, або близкие», «приятели полюбовные», «суседы околичные», «жонки» служэбныя, «девки сеные», «молодцы», «свещеники», кухары, півавары...

Сьвяты пачыналіся, жаніх ехаў па маладую, вясельны паязд вяртаўся ў дом, прыяжджалі й сядалі за стол госьці. У залежнасьці ад гаспадаровай заможнасьці гасьцей частавалі і трактавалі рознымі «речами стравными». На вясельныя сталы выстаўляліся: гусі, куры, мяса ялавічнае, вепруковае, кілбасы, сала, селядцы, «щуки вялые», масла, сыры, пірагі, хлябы-калачы, агуркі салёныя і капуста з кадак, рэпа і морква з бочак, цыбуля, часнык, гарох, мак, яблыкі, грушы, яблычны квас, а найважнейшымі пачастункамі, вялома, былі мёд, піва ды гарэлка «аквавита», якія прыгадваюцца бочкамі, вёдрамі, ушатамі, лаханкамі вялікімі, квартамі. Варылі гэтыя напоі загадзя ў адмысловым начыньні: мядзяных гарэлачных і піўных катлах.

У п'яным гармідары, зразумела, не абыходзілася без усялякіх здарэньняў, часам кур'ёзных, часам злачынных, якія потым са слоў скаржнікаў траплялі на старонкі судовых кніг*.

Так, у маёнтку Камень Менскага ваяводзтва пацярпеў на вясельлі ў доме маршалка Херубіна Дыбоўскага староста Філон Рагоза. На ягонае багатае адзеньне пакваліўся пахолак** Аляксандар і, улезшы праз вакно «до упокою... взяв... одну курту аксамиту блекитного, лазурового, подшитую отласом жолтым, а другую курту аксамиту чорного... галетам чирвоным подшитую, простирадло коленское с корунками в коло обшитую, каптур рысями подшитый...» Рабаўніка на чужым кані злавілі ажно пад Полацкам, пасьля чаго даведаліся, што «на веселю подпившы... не мог кривды своей помститься на том, хто ми дал у губу, а ведаючы... о зложеню речей пана старосты и маючы злой умысел от злого духа натхненый...» нашкодзіў багатаму госьцю.

Але ж п'янелі й дурэлі на вясельлі ня толькі пахолкі, але й больш паважныя асобы, як, прыкладам, старэйшы сват — шляхціц з выкручастым імем Цэзар Грандэзолі. Пасьля пераносінаў у м. Глебіцкім Менскага ваяводзтва «... сам пан Цэзар Грандезолей... будучы початком до звады і до всего злого... под вечор, зволокшысе з сорочок, наго ходечы по дому... выбивши до осети окно, где пан Беняш Езофович з малжонкою своею был, дрождчами з сикавки их поливал, а потом, отшодшы от пана Беняша, оттявшы замок до пуни, где иншие прыятели сховане мели... и запсовавши так же дрождчами их самых... А потом мало на том маючы вжо в ночы прышодшы до клети, где пан Семен Михайлович з малжонкаю своею спал и на отпочынок свой пошли были, он... з слугами своими и возницами выбивать были почали до клети двери и невыбивши дверей, драницы вси скидавши, почал се до клети добывать...». Закончыліся гэтыя начныя прыгоды бойкай на ганку з шваграм.

Сваты ж тым часам выконвалі важную ролю ў вясельным рытуале. Менавіта яны суправаджалі маладога жаніха «поймуючы ему девку». Але з шматлікім і вясёлым шлюбным паяздам адбываліся зусім прыкрыя здарэньні, як, прыкладам, з баярамі маёнтка Трусавічы ўзімку. «... у неделю... ездили з ним (жаніхом — В.Б.) по девку... в стан малженский тую девку у

*Працяг на старонцы 8*

* Нашыя прыклады ўзятыя з актавых кніг Менскага й Слонімскага гарадзкіх судоў другой паловы XVI ст. (фф. 1727, 1737).

** Слоўнік старабеларускай актавай мовы друкуецца ў канцы тэксту.





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# ЧАРОЎНАЯ ХАТКА

Сяргей Месьціч

I.

З усіх галінаў эканамічнага, палітычнага ды навукова-культурнага жыцьця Беларусі толькі гістарыяграфія здолела атрымаць неблагі плён на неўраджайнай ніве Першых Гадоў Незалежнасьці, — ствараецца нават уражаньне, што гісторыкі зрабіліся цяпер найбольш актыўнымі й пасьлядоўнымі руплiўцамі Адраджэньня, так бы мовіць, авангардам беларушчыны. Але ж інфармацыйны выбух, абумоўлены іх чынам, не спарадзіў якасных зьменаў у гістарычнай мэтадалёгіі, — адсюль неглыбокая прапрацоўка і асэнсаваньне гэтай інфармацыі; не адбіўся ён таксама ані на гістарычнай адукаванасьці грамадзтва, ані на гістарычнай сьвядомасьці ўладаў, — і тут бракуе новых падыходаў, новых мэтадаў папулярызацыі.

Цяпер ужо нельга цалкам разьлічваць на дзяржаву, — трэба рупіцца аб канкурэнтаздольнасьці сваіх гістарычных канцэпцый і вытворнай ад іх мітаграфіі — ад коміксаў да гістарычных раманаў ды мастацкіх стужак — на беларускім ідэалягічным рынку, дзе рэй вядзе больш распрацаваная й дасканалая расейшчына.

Пакуль жа справы такія: беларуская нацыянальная гістарычная канцэпцыя ўжо прыдатная для таго, каб легчы ў падмурак дзяржаўнай ідэалёгіі — чаго ня скажаш аб паспалітым, цывільным яе ўжытку, бо дзеля апошняга спажывай зьяўляюцца не груваасткія ідэалягічныя маналіты, гранітныя глыгі, а просьценькія цаглінкі — міталягемы... Падобнае становішча і з гісторыка-мастацкай літаратурай, у якой сёньня валадарыць жанр дыдактыка-іканаграфічнага жыцця. Каб пазьбегнуць гэтых самаабмежаваньняў, наступ гістарычнай навукі на недасьледаваныя абшары мінуўшчыны мусіць зрабіцца татальным і, акрамя гісторыі дзяржавы ды герояў, гісторыі палітыкі ды ўлады, ахопліваць і гісторыю прыватных інтарэсаў — гісторыю чалавека.

Аб чым марыў, як бавіў час, як ствараў свой дабрабыт наш продак — не кароль і ня князь (у большасьці з нас не князі былі продкамі), — большасьць нас (сярэдні стан) хоча ведаць, як жылі іх прадзеды — не магнаты і не жабракі — тагачасны сярэдні стан. Іх гісторыя — гэта гісторыя штодзённасьці, будзённасьці, звычайнасьці. Зь яе паўставалі вялікі чын, талент, сьвята — і нашая сучаснасьць — нашая штодзённасьць, будзённасьць, звычайнасьць.

Сучасны гісторык можа пайменаваць нам усе беларускія кляштары ды манастыры, але як жылі за іх мурамі людзі, чаго дамагаліся, — ён нам ня скажа.... Гэты самы гісторык здолее назваць лічбу ўсіх карчом ды шынкоў Вялікага Княства Літоўскага, але аб начыньні гэтай карчмы, аб норавах яе заўсёднікаў, — ён нам не апавядзе. Не апавядзе й літаратар, бо для яго фантазіі акурат такія пабытовыя драбніцы й неабходныя, як каталізатар. Таму гэтак патрэбна нам цяпер гісторыя дачыненьняў чалавека і ўладаў, чалавека і грамады, чалавека і рэчаў.

Дасьледаваньні па гісторыі штодзённасьці патрэбныя аднак ня толькі як матрыцы будучых мастацкіх кніжак, але й як аргумэнт у ідэалягічным падмацаваньні беларускай ідэі. Гісторыя штодзённасьці ў сучасных беларускіх умовах — найбольш дзейсны сродак выхаваньня патрыятызму.

Каб давесьці, што нейкі вялікі літоўскі князь — насамсправе беларускі князь, а русіны — гэта беларусы, патрабуецца шмат высілкаў. Да таго ж, карыстаючыся тымі ж мэтадамі, гісторык іншай арыентацыі можа давесьці й адваротнае: каталікі будуць палякамі, а праваслаўныя — расейцамі... Годзе ўжо даводзіць некаму, што беларусы маюць права на сваю гісторыю. Галоўны аргумэнт тут — нашае сучаснае існаваньне. Гісторыя — гэта трафей. Беларусы выжылі й адпаведна атрымалі свой трафей — гісторыю гэтай зямлі... Калі ж звыш гэтага найгрунтоўнейшага аргумэнта нашым гісторыкам заманецца яшчэ нешта даказваць ці ўлагоджваць пакрыўджаных, — то гэта занадта.

Гісторыя штодзённасьці — гэта й ёсьць акурат спроба перайсьці ад апраўданьняў і доказаў да разважнага, нетаропкага асвойваньня НАШАЙ мінуўшчыны.

II.

Чалавеку, які наважыцца атрымаць поўнае ўяўленьне аб Беларусі ды беларусах, я б параіў не сьпяшацца звярнуцца да мастацкай або навуковай літаратуры, а пачытаць найперш зборнічак беларускіх народных казак, — аніхто не сказаў яшчэ гэтак поўна й трапна аб нас, як зрабіў гэта сам народ. Насуперак літаратарам ды навукоўцам гэтыя казкі пакінулі нам вобраз не пацяўпешкі-бедака з каўтуном у валасах, а дасьціпнага добрага чалавека, які верыў у сваю будучыню й любіў родную зямлю.

Беларускія народныя казкі цалкам могуць быць скарыстаныя як крыніца па гісторыі штодзённасьці, але й без навуковых трактовак і прачытаньняў яны зьяўляліся й зьяўляюцца цяпер сапраўднай энцыкляпэдыяй беларускага жыцьця (ад побыту да духу), якая ня толькі акумулявала раней праявы беларускіх рэалій, але й цяпер брыняе новымі сэнсамі.

Мы ходзім сярод зданяў літаратурных ды мітычных герояў, а краявіды чужых краінаў бачым вачыма іх пісьменьнікаў. Згадай Францыю, і паўстане вобраз д'Артаньяна...

Здаецца, іншыя законы дзейнічаюць у Беларусі. Можна сказаць — Францыя Бальзака, Расея Дастаеўскага... Можна сказаць — я — гэта Беларусь, але Беларусь ня можа быць пайменаваная імем нават самага выбітнага з нас. У нас пакуль не будуюць трыумфальных брамаў героям, імі тут мосьцяць бальшакі — Беларускі шлях. Талакой мы ствараем сваю Беларусь. Наша мінуўшчына — гэта гісторыя не зьдзяйсьненьняў, а тварэньня. Таму слушна вывучаць гісторыю ня толькі героя, руху, але й гісторыю непайменаванага летапісам чалавека з грамады, — мы мусім адшукаць імя невядомага творцы штодзённасьці...

Беларусь — што тая казачная хатка з сыру ды бліноў... Стаіць яна на сонечнай паляне, сьцеражэ яе пушча. Трапіў аднойчы туды чалавек і застаўся назаўсёды, — упадабаў, бо была тая хатка пупом зямлі і адначасова яе ўскрайкам...

Гэта Беларусь — пуп зямлі і яе ўскраек — пункт пэўнасьці, Беларусь ідэальная, а іншай няма — такой пакінулі нам яе ў спадчыну дзяды.

Гісторыя гэтай Беларусі не патрабуе бразготнай ды бліскучай штукарскай аздобы а ля «Залаты век», — казку можна пачуць у цішы штодзённасьці.



*Здымак Алеся Крыштаповіча*

# ВЯСЕЛЬЛЕ

*Працяг са старонкі 7*

боярина..., то... могло быть з полгодины в ночы, едучи з девкою назад дорогою звыклою... перенявшы тых бояр... и князя молодого жениха подданые пана Яна Глебовича оных сватов киими збили и зранили, а других также мордовали и шкоды немалые починили, ... на той панне по которую ездили згинула шапка оксамитная з бобром чорным..., на свасе Тотяне... згинула... шапка оксамитная з бобром чорным, однарадка... сукна люнского синего». У другіх спадарожнікаў былі зьняты і скрадзены: «ермяк каразеи чырвонос з шнурами, едвабю блакитною подшитый», «колпак сукна бурнатного», «дылея фалендышу бурнатного», «дылея сукна муравского шарого». Апроч того — шаблі, коц белы і г.д.

Але зусім жахліва для сям'і выглядала выкраданьне нявесты (пры яе згодзе ці нязгоде) напярэдадні вясельля іншым ахвотнікам, як тое здарылася ў Радзівілавічах Слонімскага павету ў баярскай сям'і. «... звенчалом за пасынка своего дочку у боярына Юхна именем Ядвигу, которому веселю рок зложон у неделю тепер прышлую... где сватаючися тое девки и на венчане наложилом немало... згатоваломся ку свадбе, яко с пивами, горелками и иншими потребами на чом немало шкоды и часу пристойного... на реестры показать мам. То пак дей ночи теперешнее з четверга на пятницу тую девку боярин Яско... выкрадши з дому отца ее... утек проч...».

У іншым выпадку жаніх сам не зьявіўся на вясельле, пасьля чаго разгубленыя бацькі нявесты хадзілі з скаргаю да суда: «жаловал... боярин с Плавского Славута, иж дочку свою змовил был у малженство за мещанина Мартина и рок веселю певный был положен Запусты маселные, ку которому року зготовалом досыть, позвавши приятел, ожидаючы того зятя своего, свадболалом пива и меды, иншые потребы принадлежачые ку веселю потравил, а тот зять мой сам не был и дочки моее не брал, у шкоду не малую привел».

Бацькі дзяўчыны рыхтавалі пасаг, які аддавалі жаніху, часам уваходзячы пасьля гэтага ў вялікую нястачу. Так падданая-удава Ганна Сямялетчыха выдала за дачку Кацярыну «... статку каров две, овец — чатыры, куров тры, кожух бараний, сермягу белую и лес, што была патреба...» За дачку Ясю другі падданы даў: «... корову с телем, овец двое, свиню, коз две, платя сукня лунская бурнатная, сермяга, сорочок пять, скатерть, чепцы — чатыры, узголове одно, колвнер шолковый, тесма за 6 гр.»

Бацькі жаніха апекаваліся самім вясельлем, выкладаючы вялікія грошы, і таму, калі маладая жонка не прыжывалася ў новай сям'і і ўцякала назад у бацькоўскі дом, бацька маладога мужа выпраўляўся на пошукі, памятаючы ўсе свае вясельныя страты. Пра гэта — наступны фрагмэнт з актавых кніг:

«... у свата своего знашол (нявестку — В.Б.) и правом... презыскал на свату своем за шкоды, што на свадбу, женечи сына, наложил 30 коп грошей... ниж ли тот сват мой нехотечи мене тых шкод платити, дочку свою, а невестку мою мне выдал».

Увогуле, бацькі мелі вялікую ўладу над жыцьцём сваіх дарослых дзяцей. Зь іх згоды, а то й парады рабіўся выбар, менавіта яны зьвярталіся з скаргамі ў суд, зь іх слоў пісар запісваў пра здарэньне ў сям'і маладых.

«... отдал был дочку свою Неделку вжо тому год пятый... Грышка (муж дачкі — В.Б.) отпор чынил. Я дочку его, а жоны своее не вбиваю... для чого от мене проч утекает? Пытал тое Неделко, если с мужом тым хотела мешкати? ... Не хочу... муж мой мал, со мною спат не може...» На што пакрыўджаны Грышка тлумачыў гэта тым, што жонка яму невянчальная.

Другі бацька-падданы скардзіўся ў судзе на зяця:

«... иж жону свою а дочку его Веру отгоняеть, не хотечи ее за жону мети, а жона дей ему венчальная. Кондрат (зяць — В.Б.) поведил, иж я ее не отгоняю и за жону мети хочу, одно сама от него отходит. Сенко (бацька — В.Б.) поведил, иж завжды перед врадом за жону берет, а з дому выбивает...» За што суд пакараў мужа-задзіру штрафам у тры рублі і загадаў яму тую Веру «за жону мети».

Часам бацькі заступаліся за сваіх дачок, якіх самі «замуж выправили», бачачы немагчы-



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# ВЯЛІКАЯ РАЗЬНЯ КАТОЎ

Ежы Тапольскі

**На гісторыю трэба паглядзець зусім інакш. Трэба пазбыцца звычак, да якіх прывучыла нас традыцыйнае, фармаванае стагодзьдзямі гістарычнае пісьменства, паставіць пад сумненьне зьвязаныя зь ім — здавалася б, відавочныя — філязофскія канцэпцыі. Так сьцьвярджаюць прадстаўнікі новай тэндэнцыі гістарычных дасьледаваньняў, якая разьвіваецца ўжо больш за дзясятак гадоў і атрымала назоў постмадэрністычнай.**

Постмадэрнізм — гэта адмаўленьне ў філязофіі цэлай канцэпцыі (рацыянальнай ці эмпірычнай) пазнаньня сусьвету, што бярэ пачатак ад Дэкарта й Юма, з катэгорыяй ісьціны на чале, на карысьць абсалютнага рэлятывізму.

Постмадэрнізм сярод іншага паставіў над сумненьне мяжу паміж навукай і фікцыяй, а таксама лінейна разуметы ход часу, лічачы, што ўвесь дагэтуляшні (мадэрністычны) спосаб інтэрпрэтацыі рэчаіснасьці скампрамітаваны такімі фактамі, як дыктатуры, генацыд, галакост, нацыяналізмы. Ён лічыць таксама мадэрністычныя гуманітарныя тэксты сродкамі рэпрэсіі й панаваньня адных над другімі. Рэч у тым, што гістарыяграфія з сваімі цэнтральнымі аб'ектамі апісаньня, гэткімі як нацыя, дзяржава, грамадзтва, цывілізацыя, культура, мадэрнізацыя або прагрэс, з выразнай лініяй часу, скіраванай зь мінуўшчыны ў будучыню, навязвае пэўны вобраз сусьвету. У сьвятле постмадэрністычных поглядаў гэта якраз і ёсьць від рэпрэсіі й панаваньня.

Ня ўсім прыхільнікам новага падыходу да гісторыі даспадобы знаходжаньне за межамі як рацыяналізму, гэтак і эмпірызму. Зрэшты, сам постмадэрнізм — плынь незвычайна складаная для акрэсьленьня, яна выяўляецца паступова й поўная ўнутраных супярэчнасьцяў.

## *Інтымнае жыцьцё лянгедоцкай вёскі*

Да пашырэньня постмадэрністычных ідэяў у гуманітарных навуках прычыніўся ў значнай ступені францускі філёзаф Жан-Франсуа Ліятар (Jean-Francois Lyotard), які ў 1979 годзе выдаў невялічкую кніжку «Постмадэрністычны стан» («Condition postmoderne»), дзе сярод іншага выступіў супраць г. зв. вялікага апісаньня (мэтаапісаньня), або гістарычнага пісьменства, сканцэнтраванага вакол згаданых катэгорыяў і восяў (як нацыя, дзяржава й г.д.), на карысьць раздрабненьня яго на большую колькасьць мініапісаньняў, лякальных замалёвак, якія паказвалі б непасрэдна людзей і іх погляды. Гэткім чынам гістарыяграфія й сапраўды магла б стацца апісальнай.

У сусьветнай гістарыяграфіі заўважыўся рост зацікаўленьня штодзённым жыцьцём, лёсам клясаў і маргінальных, зьнядоленых групаў, «чужых», «іншых» людзей, жанчын, плебейскай культурай, сям'ёю, біяграфістыкай, сымбалямі, формамі камунікацыі.

Узорам «лякальнага» апісаньня сталася кніга аднаго з галоўных прадстаўнікоў францускай школы Аналаў Эмануэля Ле Руа Лядзюры (Emmanuel Le Roy Ladurie) пад назовам «Мантайю, лянгедоцкая вёска ад 1294 да 1324 году».

Аўтар, чыя кніга амаль адразу сталася бэстсэлерам, стараўся на падставе пратаколаў папскай інквізыцыі паказаць жыцьцё насельнікаў вёскі Мантайю на пераломе XIII і XIV стагодзьдзяў. Гэта было магчыма, бо інквізыцыя хацела ведаць «усё» пра жыхароў Мантайю, якія сымпатызавалі катарам, прызнаным Царквою за ерэтыкоў. У выніку вёска была адданая на страшныя пакуты. Ле Руа Лядзюры перадае таксама найінтымнейшыя перажываньні людзей гэтай падпірэнейскай вёскі. Тут няма нічога зь вялікай гісторыі грамадзкіх працэсаў і вялікіх тэмаў, гэта цалкам «негістарычная» вёска, якіх было шмат, да якой вялікая гісторыя толькі нязначна дакранулася. Гэта нібы разгляд пад мікраскопам, які набліжае нас да тагачасных людзей і іх асабістых гісторыяў.

Пазнаёмімся з фрагмэнтам такога апісаньня, узятым з разьдзелу «Мімалётныя сувязі». У гэтым фрагмэнце адна з жыхарак вёскі, Бэатрыс дэ Плянісоль, мучыцца думкамі аб незаконнай цяжарнасьці падчас яе сувязі зь мясцовым пробашчам, П'ерам Клергам. «Што ж мне рабіць, калі я ад цябе зацяжару? — кажа яна сьвятару, — я буду зганьбаваная й загубленая». Аднак у Клерга на ўсё ёсьць гатовы адказ: «Я маю адно зельле, — кажа ён Бэатрыс. Калі мужчына мае яго на сабе, калі лучыць сваё цела зь целам жанчыны, ён ня можа яе апладніць і яна ня можа зацяжарыць»... Бэатрыс дапаўняе інфармацыю што да гэтага зельля: «Калі П'ер хацеў злучаць сваё цела з маім, — апавядае яна, — ён насіў (тое зельле) загорнутае ў ільняную анучку, даўжынёй і таўшчынёй у адну унцыю або на трэць майго малога пальца. Ён меў таксама доўгую нітку (або матузок), якую вешаў мне на шыі, калі мы кахаліся. А тая рэч або зельле, што вісела на канцы ніткі, апускалася ў мяне паміж грудзямі да адтуліны ў жываце (sic). Калі сьвятар хацеў уставаць з ложка, я здымала гэтую рэч з шыі й аддавала яму. Здаралася часам, што за адну ноч ён хацеў злучыцца са мною два ці болей разоў. Тады сьвятар, перш чым злучыць сваё цела з маім, пытаўся: дзе зельле?» Тут няма ні кроплі літаратурнай фантазіі. Усё ўзята з крыніцы.

## *Сьветагляд млынара*

Іншыя прыклады такога роду мікрагісторыі — гэта, напрыклад, славутыя кнігі Карла Гінзбурга (Carlo Ginzburg) і Наталі Зэмон Дэвіс (Natalie Zemon Davis). Гінзбург у кнізе «Сыр і чарвякі. Сьветагляд аднаго млынара каля 1600 году», гэтаксама як і Ле Руа Лядзюры абапіраючыся на пратаколы інквізыцыі, імкнецца адбудаваць сьветагляд ня нейкай выдатнай гістарычнай постаці, а звычайнага млынара з Фрыулі, прозьвішчам Мэнокіё, спаленага, як і Джардана Бруна, на вогнішчы за вальнадумства. Назоў кнігі быў узяты з мэтафары, ужытай гэтым Мэнокіё ў дачыненьні да ўзьнікненьня сусьвету, які, паводле яго, выдзяліўся зь першаснай матэрыі накшталт сыра ў стадыі фэрмэнтаваньня, у якім ўзьнікаюць дзіркі, а ў іх чарвякі. Гэтых апошніх млынар з Фрыулі параўноўваў з анёламі, якія ўзьнікаюць у космасе, за што й заплаціў жыцьцём.

Н.З.Дэвіс, заслужаная дасьледніца рэнэсансавай францускай культуры, узяла на свой варштат апавяданую стагодзьдзямі на поўдні Францыі гісторыю трох людзей: жонкі, мужа (які адразу зь вясельля пайшоў на вайну) і чужынца, які зьявіўся праз пару гадоў, удаючы сябе мужам, і як муж быў жанчынаю «пазнаны». Нішто не засмуціла б новага, добра зладжанага жыцьця, бо й суд схіліўся да адмоўнага адказу на скаргу сваякоў жанчыны, калі б у судзе не зьявіўся падчас адчытаньня прысуду нібыта ўжо нежывы муж, Марцін Гер.*

Гісторыя гэтая далёкая ад галоўнае (для гістарыяграфіі) плыні падзеяў і працэсаў.

Яна «іншая» (як выказалася пісьменьніца), яна набліжае нас да новага (хоць, ведама ж, можна пытацца, ці лепшага) пазнаваньня мінуўшчыны. Некаторыя мяркуюць, што апісаньне такога роду нясе ў сабе ў пэўным сэнсе надчасавыя вартасьці, так як літаратура або паэзія.

* Фільм «Вяртаньне Марціна Гера», зьняты паводле адпаведнай кніжкі, ішоў у беларускім кінапракаце ў 1984 г. (Заўвага рэдакцыі.)

## *Позірк праз мікраскоп*

Наступны прыклад мікраапісаньня, які свайго часу шмат каго агаломшыў, — гэта «Вялікая разьня катоў» Робэрта Дарнтана. Аўтар, ведамы з сваіх працаў пра гісторыю францускага Асьветніцтва (сярод іншага пра друкарска-выдавецкую гісторыю Вялікай Энцыкляпэдыі), зацікавіўся на гэты раз апісанай у зборніку анэкдатычных парыскіх гісторый (не вядома нават, ці праўдзівых) разьнёю дзікіх катоў, якая (можа быць) адбылася ў Парыжы ў 1738 годзе. Гэтую разьню арганізавалі чаляднікі з друкарні, падбухтораныя сваім майстрам, якому каты не давалі спаць. «За адным разам» павесілі, надаючы гэтаму сымбалічнае гучаньне, улюбёную котку гаспадаровай жонкі. Дакладна апісаная разьня катоў, якая відавочна ня мае ў сабе нічога «гістарычнага», расцэненая Дарнтанам як «позірк праз мікраскоп» на пэўны тып плебейскай культуры. Аўтар спасылаецца ў гэтым на канцэпцыі амэрыканскага антраполяга Кліфарда Гірца (Clifford Geertz), дасьледніка неэўрапейскіх культураў, які прапануе для іх пазнаньня мэтад г.зв. густога апісаньня. Гэтае густое апісаньне — гэта ня толькі больш падрабязнае апавяданьне, пабудаванае вакол малога прадмету, але й апісаньне свабоднае ад уступных тэарэтычных пасылак.

Мэтад Гірца быў прыняты шматлікімі гісторыкамі. За іх мініапісаньнямі хаваюцца спасылкі на пэўныя тыпы культуры: плебейскай культуры басэйну Міжземнага мора (у Гінзбурга), францускай сялянскай культуры XVI стагодзьдзя (у Дэвіс) або культуры асяродзьдзяў чаляднікаў перадрэвалюцыйнай Францыі (у Дарнтана). У Ле Руа Лядзюры за такую структурную сыстэму адліку ўзятая хатняя сялянская гаспадарка, асэнсаваная як культурная катэгорыя й жыцьцёвая вось жыхароў Мантайю.

## *Не было рэвалюцыі*

Выключэньне з гістарычнага апісаньня найагульнейшых тэарэтычных катэгорыяў дае скрайнія дасьледныя прапановы.

Некаторыя гісторыкі спрабуюць праз ператалмачэньне гісторыі такой, якою мы яе ведаем, на шматлікія лякальныя й індывідуальныя гісторыі (апісаньні) пазбавіцца наагул ад такіх зьяваў, як

*Працяг на старонцы 10*

---

масьць сумеснага жыцьця, не жадаючы ім далейшых пакутаў, выплачвалі другому боку грошы за вясельныя страты і забіралі небараку пад бацькоўскую страху.

«Жаловал подданы Кондрат на подданую Богдановую, вдову, иж дей за сына своего Ивашуту взялом в нее дочку Моню, то... она тую девку свою жону сына моего отнимает и сыну моему яко жоны дать не хочет. Богдановая поведили, иж за тыми причинами дочки своей не дам, же сын недорос лет и злое мешкане з дочкою моею мел, жона ему невенчальная. И дочка ее... поведила, иж за ним быть не хочет, мает ему шкоду, што на свадбу выложил, нагородити и што ся з рахунку нашло за мед, пиво, за мяса, гуси, куры...» заплаціць.

Другая небарака, Зіновія, двойчы ўцякала ад мужа, пакуль бацька яе «досыць не вчынил», г.зн. заплаціў за шкоды, і тады бацька маладога мужа падданы Хама пагадзіўся адпусьціць Зіновію «вольной».

«... На той невестце своей и на Лук'яну (яе бацьку — В.Б.) я, ани сын мой не маю нияких шкод искати, а ни ей забороняти за кого ити, яко усхочеть, так нехай ся справусть яко ее воля будеть».

У горшым выпадку справа магла скончыцца і трагічна, і маці заставалася адно наракаць у судзе на свайго зяця:

«... не ведаю з яких причын тую жону свою где подел без ведома чи забил ее, чи утопил ее и жадное справы о ней дати не хочет и маетности посагу ее вернути не хочеть, кеды ж она потомства жадного з ним не мала».

Здаралася, што ўцякалі й мужы, «покинувшы братка и матеру рожоных своих и теж жону венчальную». У актавай кнізе сустрэўся запіс шлюбнай дамовы, у якой жаніх перад вясельлем абяцаў бацькам нявесты «послушон быти и до смерти опатрывать и приодевать, так и во всяких потребах... помочон быть...» Абяцаўся быць «ратункам и подможеньем в старости». Але ж часам парушаў абяцаньні і ўцякаў бязь сьледу.

Крыху іншыя шлюбныя матывы й настроі гучаць у радках, якія тычацца менскай і слонімскай шляхты. Павага да асобы, гжэчнасьць і высакароднасьць змушаюць забывацца пра тое, што гартаеш старонкі судовых дакумэнтаў: «... верная милость малжонка моего...» «... взял собе за сына и зятч...», «... беручы за себе в стан светый малженский жонку зацне урожоное панее...», «... за ведомостю и позволенем матки моее милое и теж приятелей моих, пошедши в малженство...»

Пры складаньні дарчых лістоў мужы першнаперш клапаціліся пра жонак, аберагаючы іх нават ад сваіх уласных сваякоў.

«... я, зямянин... дознавши службу и великую милость ку собе жоны моее милое Раины, а про то я хотечи мети, абы жона моя по смерти моей, от близких и кревных моих жадное трудности не приймовала, записую ей по смерти моей речи мои рухомые, то есть золото, серебро, шаты, перлы, цын, меди, кони...»

«... дознавши ку собе цнотливое, верное и повольное захование и услугование от малжонки моее Ганны... теж з доброты своее, милости и ласки своее против ее, жонки моее, даю дарую...»

Наступны фрагмэнт — узор адносінаў мужчыны да кабеты, сваёй жонкі, у час ліхалецьця. У 1576 г. Літву трэсла ад набегаў крымскіх татараў. Шляхціч Міхайла Стойдзерава падае запіс у актавую кнігу: «... на тот час малжонки своее тут з собою ку сознаню прыбавити не мог для небезпеченства, которое часу теперешнего в краях нашых от татар есть».

Другое сьведчаньне — зямянкі Марыны Шчавінскай:

«... не могучы... для кривд от некоторых долеглостей на вдовем столцу мешкати пошла есми замуж за учтивого пана Яна Якубовича... который и деток набывши... и дознавши от него ку собе статечное захование и верную а правдивую милость...»

Перад вясельлем, якое мусіла адбыцца ў княскай фаміліі Гаўрылы Казбулатавіча Пяцігорца, у прысутнасьці вялікай колькасьці «зацных а пачтивых людей», вознага, бацькоў нявесты і самога жаніха вырашалася пытаньне тэрміну шлюбу і «в котором именю тое веселе мает быти». Князь-бацька пастанавіў даведацца «яко панна ... если за тым (жаніхом) в малженство ити хочет». На што маладая князёўна-паненка паведаміла перад усімі прысутнымі: «... жадным обычаем ити не хочу».

Падобная гісторыя, толькі значна больш вядомая, дзякуючы пазьнейшаму літаратурнаму твору і гістарычным нарысам*, адбылася

*Працяг на старонцы 10*

* J.I.Kraszewski. Ostatnia z Książąt Słuckich; H.Lulewicz. Walka Radziwiłłów z Chadkiewiczami o dziedzictwo Słuckie.



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# ВЯЛІКАЯ РАЗЬНЯ КАТОЎ

*Працяг з старонкі 9*

рэвалюцыя, клясавы супрацiў сялянаў або змаганьне за незалежнасьць, якія маюць сэнс толькі ў кантэксьце грамадзкіх супольнасьцяў (нацыяў, групаў і г.д.). У Джэймса К. Скота (James C. Scott) сялянскі супраціў размываецца на індывідуальныя дзеяньні без супольных мэтаў і супольнай сьвядомасьці, бо — згодна з прынятым прынцыпам — індывідуальныя дзеяньні ня могуць быць ператлумачаныя на грамадзкія. Падобна паводле Д.К.Бойса (D.C.Boyce), а таксама іншых аўтараў, наагул не было ніякай барацьбы за незалежнасьць Ірляндыі, а толькі індывідуальныя й лякальныя акцыі без цэнтральнае мэты й супольнае сьвядомасьці, якая б злучала людзей. Рэальнае толькі тое, што лякальнае, усё астатняе — гэта міт і ўмоўнасьць.




*Кабеты заваблiваюць ашалелых ад каханьня мужчын у пастку й робяць зь іх дурняў — нюрнбэрскі дрэварыт, 1530 (З «Кронікі кабет»)*

У прысутным у палітычнай гісторыі г.зв. лінгвістычным кантэкстуалізме людзі — бязвольныя аб'екты моўных умоўнасьцяў, якія «гавораць» праз іх.

Таксама й аўтар «Мэтагісторыі» Хэйдэн Ўайт (Hayden White), займаючыся інтэлектуальнай гісторыяй, дайшоў да перакананьня, што чалавечым мысьленьнем кіруюць умоўнасьці. У працы гісторыка гэта літаратурныя ўмоўнасьці, у выніку чаго няма істотнае розьніцы паміж гістарычным пісьменствам і мастацкай літаратурай (а таксама паэзіяй), калі не лічыць спасыланьняў першага на гістарычныя крыніцы. Няма таксама розьніцы паміж так зразуметай гістарыяграфіяй і філязофіяй гісторыі. Нават калі аўтар спасылаецца дакладна на крыніцы, дык і тады — цьвердзяць Ўайт і ягоныя прыхільнікі — ён будуе апісаньне бескантрольна праз суаднясеньне зь мінулай рэчаіснасьцю (г.зв. імкненьне да ісьціны), аднак гэтае апісаньне вызначаецца рэтарычнымі ўмоўнасьцямі.

Ад часоў «Мэтагісторыі» Х.Ўайта зьявіліся дзясяткі працаў, у якіх аналізуецца рэторыка гістарычнага апісаньня. У пераважнай большасьці дасьледаваліся працы французскіх гісторыкаў дзевятнаццатага стагодзьздя. Ужо ў 1976 годзе Лінда Ор (Linda Orr) выдала кнігу пра Мішле, а ў 1990 годзе пра гісторыкаў французскай рэвалюцыі, хочучы пераканаць нас, што «гісторыя й літаратура ня могуць быць акрэсьленыя незалежна адна ад адной у тым сэнсе, што першую можна акрэсьліць праз факты, а другую — праз фікцыю. Яны акрэсьліваюцца адна праз адну, сьціраючы мяжу паміж сабою».

Праграма постмадэрністычнай (апісальнай, не заснаванай на катэгорыях клясычнае ісьціны) гістарыяграфіі была найбольш пасьлядоўна й разгорнута сфармуляваная галяндзкім гісторыкам і філёзафам гісторыі Франклінам Анкерсмітам (Franklin Ankersmit) у ягонай кнізе «Апісальная лёгіка» (1983). Паводле Анкерсміта, гістарычнае апісаньне — гэта ня штось накшталт карты, дзе паказаны гістарычны «краявід», яно само (як мова ў дэ Сасюра) прылада стварэньня вобразу мінуўшчыны. Бо наколькі мы можам гаварыць пра сапраўднасьць інфармацыі аб паасобных гістарычных фактах (такіх, для прыкладу, як «у 1543 годзе памёр Мікалай Капэрнік»), нагэтульки гэта ня мае сэнсу ў выпадку г.зв. апісальных субстанцыяў або гістарычных вобразаў (цэласьці), якія зьвязваюць паасобныя факты, такіх, напрыклад, як «рэнэсанс», «француская рэвалюцыя» або «другая сусьветная вайна». Усё гэта творы гісторыка, якія мы параўноўваем зь іншымі падобнымі творамі (таксама іншых гісторыкаў), але не з гістарычнай рэальнасьцю. Таму яны ані сапраўдныя, ані фальшывыя. Яны могуць быць толькі навукова лепшыя або горшыя. Апісальныя субстанцыі — тэксты, падобныя да рэчаў, якія ня маюць лягічнае сувязі зь мінуўшчынай, нічога пра яе ня кажуць, а толькі яе (як манэкены) прадстаўляюць. Праца гісторыка такім чынам робіцца гульнёю тэкстаў, а не гульнёю з рэальнасьцю. Такія тэндэнцыі выклікалі бурлівую рэакцыю Лорэнса Стоўна (Lawrence Stone), які гадоў за дзесяць перад тым з задавальненьнем вітаў ажыўленьне апісальнай гістарыяграфіі. Цяпер ён выступае супраць постмадэрністычнага апісальніцтва, якое губляе з вачэй гісторыю, а гісторыка зьмяшчае, паводле словаў Стоўна, нібы ў люстраным пакоі, дзе тэксты не адлюстроўваюць «нічога іншага, як толькі сябе самых», не праліваючы «ніякага сьвятла на ісьціну, якая не йснуе».

## *Ісьціна й міты*

**Прапановы дэканструкцыі йдуць аднак яшчэ далей. Вось Элізабэт Дыдс Эрмат (Elizabeth Deeds Ermath) у сваёй кнізе «Дапаўненьне да гісторыі. Постмадэрнізм і крызыс лінейнага часу» (1992) абвяшчае неабходнасьць адыходу ад нашых састарэлых меркаваньняў пра гісторыю й гістарычнае апісаньне. Гістарыяграфія мусіць адкінуць усе структуры, якія мацней арганізуюць тэкст, асабліва лінейную часавую вось, і свабодна перамяшчацца па лініі часу, аддаўшы такім чынам перавагу часу, які аўтарка называе «рытмічным». Узорам для гісторыкаў мусяць быць перадусім такія пісьменьнікі, як Хулiё Картасар, Уладзімер Набокаў або Ален Роб-Грые.**

Некаторыя лічаць, што гістарыяграфія перажывае стан глыбокага крызысу. Гэта спрэчна, хоць бясспрэчны крызыс у філязофіі, якая ўжо ня можа вярнуцца да традыцыйнай эпістэмалёгіі й да клясычнай канцэпцыі ісьціны (званай «мэтафізычнай» або «наіўнай»). Гісторыкі наагул працуюць «нармальна», ня надта праймаючыся постмадэрнізмам. **Варта аднак уважліва сачыць за тым, што дзеецца ў філязофскім акружэньні гістарыяграфіі.** Гэта было, можа, ня так важна, пакуль гэтае акружэньне (у яго пазытывісцкай форме) не ўвайшло ў супярэчнасьць з штодзённым мысьленьнем гісторыкаў, зь іх разуменьнем мовы й асабліва ісьціны. Можна не падзяляць дэканструктывісцкіх канцэпцыяў і прызнаваць неабходнасьць спасыланьня на катэгорыю ісьціны.

**Трэба аднак усьведамляць, што гэта ўжо ня можа быць старая «наіўная» ісьціна, нібыта адзіная, заўсёды (калі наша) лепшая за чужыя. З апісальніцкіх аналізаў таксама выразна вынікае неабходнасьць скептычнага стаўленьня да гістарычных крыніцаў. Бо яны не ўяўляюць сабою нейкай, як гэта здавалася клясычнай гістарыяграфіі, каралеўскай дарогі ў мінуўшчыну.**

Гісторыкі хутчэй за ўсё падобныя да паломнікаў, якія блукаюць па блытаніне скрыжаваных сьцежак, увесь час пытаючыся пра дарогу і атрымваючы аблудную інфармацыю, пры гэтым мэта, да якой яны йдуць, мае неадназначныя абрысы, якія расплываюцца й аддаляюцца як лінія небакраю. **Усьведамленьне гэтых цяжкасьцяў ня можа аднак, як гэта часта падкрасьляецца ў сёньняшніх мэтадалягічных дыскусіях, аслабляць імкненьня гісторыкаў да ісьціны, нават калі б гэта не была ўжо клясычная, пазытывісцкая ісьціна, а шмат розных ісьцінаў. З гэтай прычыны штораз болей асноўнай прыладай працы гісторыка мусіць быць дыскусія. Тады ў гістарыяграфіі мітаў будзе менш, а прагрэс у пазнаньні мінуўшчыны будзе больш.**

«Polityka»

# ВЯСЕЛЬЛЕ

*Працяг з старонкі 9*

ў другой сям'і з славутымі ў гісторыі асобамі — Сафіяй Алелька, княжной Слуцкай і Янушам Радзівілам. Гісторыі іх шлюбу прысьвечана не адна старонка актавай кнігі. Дзень шлюбу 6 лютага 1600 г. ледзьве ня стаўся пачаткам ваеннага канфлікту паміж славутымі родамі Хадкевічаў і Радзівілаў. Прычыны гэтай варажнечы — у мудрагелістых плянах, хцівых намерах, прагных памкненьнях апекуноў, бацькоў і іншых уплывовых асобаў, і насуперак гэтаму — жывая душа маладой князёўны, пра якую, падобна, забыліся абодва бакі. «... У неделю за тыдень перад Запустами рымскими... в месте Виленском на Савичой улицы... в каменицы» Хадкевіча, перад вялікай колькасьцю розных людзей: шляхты, возных, «приятелей», гр. Геранім Хадкевіч «княжну ее милости Слуцкую ставил поранку...», чакаючы прыбыцьця жаніха «... зо всякою хутью и доброю волею пана Януша Радивила и с прыятелы ожыдал и прыняти их... на тую потребу в дому своем ест готов... маючы дом незамкненый.... нижели Януш Радивил до тое патрэбы своее не прибыл». І тады сваё слова сказала сама нявеста: «... пан виленский (Г.Хадкевіч — В.Б.) если чынил постановеня з паном воеводою виленским (Радзівілам — В.Б.) в недорослых летех моих, не будучы ведом воли моее, а снат и тое близкое кревности, которое межи мною и Янушом Радивилом есть, так теж и того, иж... пан Януш Радивил не есть набоженства костела кателицкого, которогом я есть, о чом всем я теперь, маючы лета зупольные, а взявшы певную ведомость и постерагаючы того, абым таким непорадком и с тем моим за... пана Януша Радивила вперед Пана Бога не абражала, а потом, абых теж учстивости и маетностей моих до жадных небеспечностей не приводила... на тое постановене через... пана виленского з паном воеводою виленским учыненое не позволяю и в малженство з... паном Янушом Радивилом встоповать не хочу и прошу, абы ми се от... пана виленского жодное безправе не делало». У гэты дзень шлюб так і не адбыўся.

Зь іншых крыніц вядома, што гэта здарылася 15 кастрычніка 1600 г. у Берасьці Літоўскім.

Захавалі актавыя кнігі як прыклады шчырай прыязнасьці й вернасьці паміж сужэнцамі, нават мужнасьці падчас трагічных здарэньняў, так і выпадкі прыкрых і грубых адносінаў паміж мужам і жонкай.

«... жона его именем Райна, слышачи то в дому своем, иж мужа ее бьют, побегла там же і гды... прибегла, том пала на мужу своем крижом, хотячи мужа свойго от битя ратоват...»

«... словы неучстивыми соромотил... а потом ковшом з пивом на нее кинул и вдарил...»

Уратуй мяне, мой Божа,
Ад напасьцяў жудасных:
Ад ваўка і ад мядзьвэдзя
І ад мужа-п'яніцы.

(Латыскія дайны)

*Слоўнік старабеларускай актавай мовы*

ВОЗНЫ — судовы выканаўца
ВРАД — суд
ДЫЛЕЯ — верхняе мужчынскае адзеньне, падшытае футрам; плашч
ЕРМЯК — шырокі плашч без рукавоў, накідка
ЗАПУСТЫ МАСЛЕНЫЕ — апошнія дні напярэдадні Вялікага паста
ЗУПОЛЬНЫЕ ЛЕТА — паўналецьце
КАРАЗЕЯ — простае тоўстае сукно
КОЛЕНСКИ — 1. кёльнскі; 2. з г. Колін у Чэхіі
КОЦ — 1. кілім; 2. коўдра; 3. плашч з аўчыны
ЛЮНСКИ — галяндзкі
МАЛЖОНКА — жонка
ОДНАРАДКА — даўгаполы аднабортны жупан без каўняра
ОПАТРЫВАТЬ — апекаваць
ПАХОЛАК — 1. сялянскі хлопец, работнік; 2. збраяносец шляхцічаў
ПРЕЗЫСКАТЬ — патрабаваць праз суд
ПРОСТИРАДЛО — прасьціна
СИКОВКА — ручная помпачка
УЗГОЛОВЕ — падушка
ФАЛЕНДЫШ — тоўстае, пругкае галяндзкае ці францускае сукно
ХУТЬ — дабразычлівасьць



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# Ліст, пісаны непадалёк ад Рэдынгскай турмы

Мэва Марон

Адзін сябар з Чэплізоўду даслаў мне калядны нумар ірляндзкамоўнага месячніка «Comhar», з партрэтам Кахала О Шаркі (Cathal o Searcaigh) на вокладцы на фоне донэгалскага краявіду зь верасамі й каменьнем ды зь вершамі ўнутры часапіса: ягонымі «Хайку зь Італіі», значна цікавейшымі за іх трыма перакладамі Кавафіса, двума ўрыўкамі з п'есы пра Саламею «Месячнае сьвятло ў Галілеі» ды «Авечкамі» Дэрэка Томсана (з шатляндзкай мовы):

*«... як бы ўсьцешылася маё сэрца*
*калі б я пабачыў на гэтай белай*
*[ад сьнегу] раўніне жоўтую пляму*
*і зразумеў бы: то подых кельта*
*прабіўся праз сьнег».*

Вершы Кавафіса пазнаюцца не адразу: нельга проста перакласьці назоў і спадзявацца знайсьці арыгінал (або польскі пераклад Зыгмунта Кубяка) ў паказальніку. «Сьнежань 1903» стаўся «Каханьнем», «На караблі» — проста «Малюнкам». Некаторыя словы бясспрэчна належаць Кавафісу *(«... успамін пра яго валасы, яго вочы і вусны... / надаюць маім словам і форму, і колер / што б я ні казаў»)* — але нават калі яны й нагадваюць абрысы арыгіналу, усё адно няма рады: вершы страцілі гэтыя абрысы па дарозе ў Ірляндыю. А назовы мясцовасьцяў перабраліся ў Донэгал.

Перасадка эўрапейскіх або японскіх вершаў на ірляндзкую глебу праз ангельскія пераклады выдатна ўдалася О Шаркі, нават больш чым выдатна: выдаўцы двухмоўнай анталёгіі ўлучылі ў падборку з дванаццаці вершаў адзін, у якім пазнаецца пераклад «Алоўка» Тыматэўша Карповіча — Карповіча ў духу «Каменнай музыкі», а не «Адвернутага сьвятла», праз англамоўную Мілашаву анталёгію шасьцідзясятых гадоў — аднак спасылкі на Карповіча няма ні на адпаведнай староцы, ні ў заўвазе на задняй вокладцы, як у кнізе самога О Шаркі.

Наступная гэткая анталёгія, без папярэджаньня ў рэцэнзіях, улучала «Поры году» сярод трох вершаў О Шаркі:

*«Летні лівень на ўзгорках —*
*праз цяжкі вадаспад дажджу*
*я чую, як дояць тысячу кароў*

*Сярод зімовай белі ўзгоркаў*
*стрэхі набрынялі марозам —*
*зь іх цыцак капае цішыня».*

Таму, хто выхаваны на тых самых кнігах, гэта адразу нагадвае адзін цудоўны валійскі *englyn* (эпіграму ў грэцкім сэнсе гэтага слова) з анталёгіі Энтані Конрана «Penguin Book of Welsh Verse» (тая самая сэрыя, той самы час), «Стрэхі» Эліса Джоўнса:

*«Яны пяшчотна зьвіняць, пакуль*
*ідзе дождж,*
*нібы дояцца тысяча кароў;*
*калі страха зарастае лёдам,*
*пад ёй вырастаюць дзівосныя цыцкі».*

Даўжыня радкоў дае тут уяўленьне пра форму арыгіналу, але не пра ягоныя рыфмы.

Аднак Гэбрыэл Роўзэнсток, сам нястомны перакладчык, ужо з захапленьнем цытаваў «Поры году» на пачатку сваёй прадмовы да кнігі О Шаркі «Суіні», параўноўваючы яго з Басё й Іса, нібыта гэты твор найлепей прадстаўляў паэта! (Я не хачу сказаць, што гэта чыста ірляндзкая зьява: я толькі што бачыла адзін з найвядомейшых вершаў Элюара, прыпісаны аднаму турэцкаму паэту (не Н.Хікмету) у англамоўнай анталёгіі!)

Дзеля інфармацыі: у сьпіс крыніцаў на задняй вокладцы «Суіні» улучаныя, апрача Джоўнса й Карповіча, верш Вісэнтэ Алейксандрэ пра старэньне (як «Озимина» Стэфаныка), coplas Антоніо Мачада пра жыцьцёвыя поры ракі (яна ўжо, ясная справа, называецца не Гвадалквівір), «Божы лёс» Егуды Аміхая, які пайшоў безь істотнае адаптацыі

*(«Божы лёс*
*цяпер*
*гэта лёс дрэваў скалаў сонца і месяца,*
*тых, каму яны перасталі пакланяцца*
*калі пачалі верыць у Бога.*

*Але ён змушаны заставацца з намі*
*як застаюцца дрэвы, як застаюцца скалы*

*сонца месяц і зоркі».)*

і некалькі японскіх вершаў у перакладзе Джэймса Кэркупа. А таксама адзін амэрыканскі верш нейкай жанчыны, пра якую я нічога ня чула, пра Джоні Яблычнае Зярнятка, які хадзіў па гарадох і вёсках каля 1800 году й раздаваў кнігі Свэдэнборга — і яблычныя зярняты дзеля пасадкі.

Алейксандрэ ў 1977 годзе атрымаў Нобэлеўскую прэмію (калі вы забыліся), што дапамагае адгарнуць каляндар назад: у пасьляслоўі О Шаркі цытуецца Крышнамурці («калі адкрываеш усё нанова штохвіліны, без вызначальнае рэакцыі мінулага») і Алан Гінсбэрг *(«Я залажу на Манбляны Хера й дасьледую Вялікія Каньёны Дупы»),* ёсьць там і вершык Джэка Керуака *(«Ад Брукліна да Бэрклі, бутэлькі боп і будызм... Марыхуана й Містыка ў Мэксыцы...»)* — адчуваеце атмасфэру?

Дапаўняюць сцэну й назовы: «Вадохрышча», «Ператварэньне Сьвятых Дароў», «Пікадылі: настала ноч», «На гары» (ня там, дзе казалася Казань, а пад страхою ў доме!), «Калі ты едзеш у Сан Фалкара, завяжы валасы ружанцам», «Мая Багема» (санэт Рэмбо для падарожніка на падарожных, з бліскучымі гузікамі на джынсах...)

Але вершы самога О Шаркі выглядаюць занадта сьціпла пасьля ўсёй гэтай рэкламы. У яго ёсьць неблагія хайку:

*«Аскепкі парцаляны*
*бялеюць зырка на дзірване*
*— поўня ў балотных правалах».*

або

*«Летняя раніца*
*трава перагукаецца зь*
*зеленьню майго шэдру».*

Аднак тыповыя для яго вершы — успаміны з маленства ў Донэгале (ягнятка, што памірае на недаступным выступе стромай скалы, разьдзіранае крумкачамі — гэтая сцэна разьвіваецца ў вобраз гаротнага стану мовы) ды стогны аб жыцьці ў Лёндане, сумесь, якую што ні далей, то ўсё лягчэй прадказаць.

Хто хоча, можа й сам скласьці штосьь падобнае, ужыўшы іншыя назовы й краявіды. Вось толькі пара цытатаў.

*«Часам я адчуваю ў гэтай маслабойцы*
*вуліцы*
*місу масьлёнкі*
*у форме верша».*
(High Street Kensington, 6 p.m.)

*«Тут у горнай лагчыне*
*цішэй, чым у вясковай капліцы.*
*Схаваўшы шапку ў кішэню, я ціха*
*спускаюся*
*па мшыстым дыване праходу*
*між лавамі, між пукамі травы*
*і на момант спыняюся перад алтаром*
*тым часам як лёгкі ветрык, кадзільшчык*
*дыміць паўсюль верасовым кадзілам».*
(Сьвятыня)

Праўда — другі верш занадта добра нагадвае «Імшу ў гаі» Давіда ап Гўіліма... Але тым часам як Давід трымаецца валійскіх узораў чатырнаццатага стагодзьдзя (ці трэба казаць, што ў тым стагодзьдзі ён быў найвялікшым паэтам Эўропы?) і слухае дразда, які прыносіць яму вестачку ад каханкі, О Шаркі безь вялікага бляску супрацьстаўляе «Творцу Стыхіяў» і «грубую пабожнасьць амбонаў»...



Вось жа, як бачыце, выдаўцы падбіраюць творы, у якіх гаворыцца па-ірляндзку нешта новае, якое б ні было (тым больш прыхаванае) іхнае паходжаньне. Верш «Словы й браты» гучыць так, нібы ён меў нейкі польскі прататып

*(«Усе мы браты,*
*сказаў манах майму тату,*
*але калі я адказаў*
*на гэты ліслівы штамп:*
*«Як Каін і Авэль?»,*
*я здрыгануўся, бо адчуў*
*як ягоныя вочы братазабойцы*
*глыбока пратнулі мне сэрца».),*

але я не магу здагадацца які. Ружэвічаў «Дыялёг» 1966 году

«Na brzegu czarnego
morza
rozmawiałem z rosyjskim poetą
o poezji o Gogolu...»

— магчыма й мае падобную схему, не такую простую, але я ніколі ня бачыла гэтага верша па-ангельску.

О Шаркі мае свае прычыны не давяраць царкве. Кампанія Кавафіса і Ўайлда (праз Саламею) падказвае, што ён гей, а пра такія рэчы сёньня ўжо можна гаварыць адкрыта ў Ірляндыі, нават калі грамадзкая думка й адстае ад закону. Раней — так, трэба было добра ведаць ірляндзкую мову, каб адрозьніць «яго» ад «яе» (*яго* валасы й г.д. — Кавафіс у арыгінале абыйшоўся без займеньніка, а ангельскі перакладчык ужыў надзейнае «твае»!), бо род у такіх спалучэньнях вызначаецца паводле наяўнасьці або адсутнасьці прыдыханьня ў пачатковага зычнага, таму гэткі верш мог успрымацца як апяваньне «звычайнага» (гетэрасэксуальнага) каханьня...

Таму й ня дзіва, што ва ўрыўку зь «Месячнага сьвятла ў Галілеі» Саламеі не ўдаецца спакусіць Яна Хрысьціцеля. Гісторыя Саламеевай тэмы ў ірляндзкай літаратуры даўжэйшая, чым дзе. «Ірадыяда» Флябэра (і, ведама ж, Малярмэ), Гюйсманс, «Саламея» Ўайлда, а тады ў 1912 годзе «Тэтрарх Галілеі» Падрыга О Конара (Padraig O Conaire), хутчэй адказ Флябэру, чым імітацыя, дзе тэма трансфармуецца такім чынам, што праліваецца сьвятло на сказанае вышэй.

Флябэр пачынае з цудоўнай панарамы, поўнай экзатычных іменаў, О Конар — зь Ірада, у целе якога ўжо завяліся чэрві — дзе ён: у зямлянцы або ў магіле? — вось толькі назоў Галілея падазрона нагадвае Голўэй. Іраду нададзена ягонае кельцкае імя — Іэруэй (Ioruaith), якім усё яшчэ называюць дзяцей у Валіі, і гутарыць ён з хлопцам, якога завуць Рэшынь (вельмі падобна да Рошынь — Ружы).

Флябэр падае мэню, дзе ёсьць пунсовыя дразды, салаўі й мышы-соні («пакуль сьвятары разважалі над уваскрасеньнем»), а таксама дзікія галубы, якіх самаране адмаўляюцца есьці (табу), тым часам як О Конар абыходзіцца вінам колеру галілейскіх (голўэйскіх?) хваляў у зімовы дзень і надзяляе Саламею голасам дразда — ірляндзкі штамп — а значыць, голасам больш салодкім і мілагучным, чым у галубоў у дуброве.

У О Конара *бугай* крычыць у пустэльні (голас, «што крычыць у пустэльні» належыць Яну Хрысьціцелю) — гэты крык далёкі, так сказаўшы, ад Флябэравага краявіду (ягоны Ян Хрысьціцель бачыць яго «квітнеючым, як ружа» калі змрок зьмяняецца сьвітаньнем...), а гэтая птушка, жыхар трысьнягоў, зьяўляецца ў Бібліі толькі тады, калі Ісая пагражае новым Патопам! А словы Яна Хрысьціцеля маюць «колер неба перад дажджом» — пагроза або абяцаньне? (Ёсьць цудоўная ірляндзкая элегія пра бугая, знойдзенага памёрлым каля дарогі, памёрлым ад смагі, у сямнаццатым стагодзьдзі — кажуць, аўтар сам любіў прамачыць горла...)

Флябэр расьпісвае падрабязнасьці складанай палітычнай сытуацыі, у якой даводзілася манэўраваць Іраду, зь зьняволеным Янам Хрысьціцелем як картай у ягонай руцэ, якою ён зайграе (адпусьціўшы яго?), калі прыйдзе пара й не раней; О Конар апавядае толькі пра паразу Ірада ад рук жанчыны...

У гэтым месцы мімаволі прыгадваецца Парнэл, у сваім часе «некаранаваны кароль Ірляндыі», і ягоная Кіты О Шэй (*англічанка!* ). І Парнэл, і Ірад мелі праблемы з жонкай іншага чалавека. Памятаеце Дантэ Рырдан у Джойсавым «Партрэце...» зь яе шчоткамі, карычневай у гонар Майкла Дэвіта й зялёнай у гонар Парнэла? І што яна зь імі зрабіла? Хоць Парнэл якраз вельмі не любіў зялёнага колеру... А гутарка пра яго другое прышэсьце ў «Улісе»?

Тым часам тут мы маем аб'едзенага чарвямі Ірада, які гаворыць з магілы, а ягоныя мары пра «Валадарства, Сілу й Славу» (кажучы словамі, пазычанымі з малітвы Гасподняй) «разьвеяліся, як ранішняя смуга. Адзін з Флябэравых крытыкаў кажа, што ў «Ірадыядзе» адчуваецца нейкі вакуум, пустка, маўчаньне, якія імкнуцца запоўніцца — Мэсіяй. І сцэна прыгатаваная для новага сьвету...

Парнэлава нелюбоў да зялёнага колеру была сымбалічная. Ён не цікавіўся ірляндзкай культурай. Ягоная сьмерць пазначыла канец цэлай эры ў ірляндзкай палітыцы. Гэйльская Ліга была заснаваная неўзабаве пасьля таго, у 1893 годзе. Ня кожны жадаў ягонага вяртаньня з магілы. Аднак ці не занадта я захапілася пошукам кантрасту паміж двума гэтымі творамі?

Сучаснае прачытаньне магло б навесьці на думку, што, даўшы Іраду гаварыць ад першае асобы, О Конар стаўся пачынальнікам моднага цяпер гатунку посткаланіяльнага пісаньня й гаварэньня ад імя пазбаўленых голасу. Не сказаць, каб Флябэр быў нячулы; аднак «Ірадыяда» застаецца *спэктаклем*, Тэтрарх Галілеі прымушае нас быць саўдзельнікамі драмы...

Марына Ўорнэр у нядаўняй лекцыі гаворыць пра «Карабель рабоў», карціну Тэрнэра, апісаную Раскінам («яго тонкія мачты напісаныя на палатне неба крывавымі лініямі», рабоў, што паміралі, выкідалі за борт — набліжаўся тайфун) і пра маналёгі Дэвіда Дэбідына аб тапельцах...

Але досыць прафэсарскага стылю! Дарэчы, Роўзэнсток, рэцэнзуючы нейкія ранейшыя вершы Дэбідына, сказаў, што вершы добрыя, але ўся тая лухта, што напісаная ў прадмове, выклікае нехаць і агіду! Таму скончым радкамі зь верша Кавафіса «На караблі» ў перакладзе О Шаркі:

*«Малюнак насьпех у школьным сшытку*
*нядзельнай раніцай, на пачатку лета,*
*мы плылі з Даўніз на востраў Торы...»*

(тут, ведама ж, востраў Торы, на поўнач ад Донэгала, для мяне значыць больш, чым для вас: чалавек, што жыў праз дарогу ад мяне, чытаў у Ірляндзкім Радыё верш аб затанулым караблі перад другой сусьветнай вайной...)

*«... а паўсюль вакол нас Іянічнае мора.*
*Як ён падобны...»*



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# Нумар зь відам на Градчаны

ПРАСКІЯ ЗАЦЕМКІ

Уладзімер Арлоў

Аднойчы Мікалай Бярдзясў дапіў сваю эміграцкую каву з каньяком, падыйшоў да канторкі й запісаў прыкладна наступнае: уся трагедыя Расеі ў тым, што адной нагой яна стаіць на Захадзе, а другой на Ўсходзе. «Враскоряку. Трагедия, но и своеобразие», — напружыўшыся, удакладніў мысьляра ў «Литгазете» адзін мой маскоўскі знаёмы зь юнаю жонкай і відавочнымі прэтэнзіямі на пасьмяротную літаратурную кананізацыю.

Я гляджу ў тэлеэкран на завалены мёртвымі целамі пляц перад прэзыдэнцкім палацам у Грозным і ўдакладняю калегу: каб вашая Расея мела тры нагі, яна стаяла б у Азіі дзьвюма, а каб была сараканожкаю, — усімі 39-цю. Такое вось «своеобразие». Пры гэтым я згадваю, як у Празе мне паказвалі вынікі сацыялягічнага апытаньня на тэму: «Суседзяў якой нацыянальнасьці вы не хацелі б месць у вашым доме?» Усьлед за цыганамі перадавыя пазыцыі ў рэйтынгу займалі расейцы. Гэта было ў лістападзе. Напэўна, цяпер першае месца цыганам ужо б не сьвяціла.

Можа, якраз краявід з грозьненскімі трупамі, сярод якіх адзін відочна дзіцячы, а другі падобны да мяне, і змушае нарэшце разабраць свой праскі архіў, што складаецца са сьпярэшчаных запісамі запрашэньняў, праграмак, рэклямак, візытовак і рэстаранных сурвэтак. Пасьля нялёгкіх перагавораў мая лайдакаватая памяць усё ж дае згоду заняцца расшыфроўкаю гэтай ужо амаль што абракадабры на паперы. Сабе ў пратаколе я агаворваю адзіную ўмову — пазначаць назву дакумэнта, які быў выкарыстаны ў якасьці носьбіта інфармацыі. Калі вы ня згодныя, што гэтая ўмова робіць гонар дыплямаванаму гісторыку, можаце лічыць яе праявою снабізму, хоць я трымаюся думкі, што клясычны снабізм — гэта калі сын швэйцара саромеецца падаць паліто свайму сябру.

### *Зацемкі з рэклямнага праспэкту гатэля «Атрыюм»*

Каб узмацніць верагоднае падазрэньне ў снабізме, адразу паведамлю, што ў гэтым гатэлі нядаўна спыняўся Біл Клінтан, аб чым сьведчыць ня толькі праспэкт, але й фотавыстава каля фантану з вадаспадамі ў гатэльным пасажы, дзе няблага ўладкаваліся дзевяць бараў і рэстарацыяў, па якіх найлепей сьлізгануць абыякавым позіркам здаволенага ўсім на сьвеце плэйбоя. (Тое самае датычыць і міні-бара ў нумары.) Свой комплекс фінансавай непаўнацэннасьці можна пасьпяхова перадолець дзякуючы татальнай кандыцыянэрызацыі, музычным ліфтам зь бітламі, Моцартам і фітанцыдамі, а таксама дзякуючы прыгожанькім пакаёўкам, якія ня толькі штодня мяняюць табе ўсю бялізну, але і (дорачы шматзначны позірк) заходзяць засьцяліць ложак нанач. Аднак найбольш надзейна здратаваць свой комплекс ты маеш магчымасьць падчас аплочанага разам з нумарам гатэльнага сьняданку, калі быццам кот пасьля дзясятае ўкормленай мышыны захмялела блукаеш сярод усіх гэтых ёгуртаў, ечняў з бэконам, сасісак з хрэнам, каўбасак па-праску й па-бэрлінску, сярод салатаў з усёй вядомай і невядомай табе садавінай і гароднінай, сярод пірамідаў разнастых кнышоў і цестачак і запацелых збаноў з экзатычнымі сокамі, сярод цёмнаскурых афіцыянтаў з каўнікамі, калі ленавата ўзгадваеш героя паказкі, які абяцаў калі ня зьесьць усё, дык хоць пакусаць, калі ўжо не паварочваеш свой чуйны нос гурмана на тонкі водар якога-небудзь паштэту з гусінае пячонкі. Сярод гэтага раблезіянскага багацьця ў нетрах твайго наладаванага на цэлы дзень страўніка нараджаецца самазадаволеная думка, што ў параўнаньні з Клінтанам у цябе велізарная перавага. Ты маеш усяго толькі цёплы двухмясцовы нумар на аднаго, а ён займаў цэлы паверх. А хіба можна прывесьці каго-небудзь да сябе ўвечары, калі ў цябе цэлы паверх, ды яшчэ калі яго палову займае паводле пратаколу твая жонка. Бедны Клінтан!

### *Зацемкі з запрашальніка на прыём у Гішпанскай залі Праскага замку*

Першы праскі вечар адметны, прынамсі, трыма падзеямі.

Па-першае, я ўпершыню сёлета надзяваю гальштук. Не завязваю, а менавіта надзяваю, бо — прызнаюся — завязваць гальштукі (пачынаючы зь піянэрскага) я так і не навучыўся, а таму прывез зь Менску ўжо завязаны.

Па-другое, кіраўнік кітайскае дэлегацыі на відавоку ў астатняй публікі дастае сьпіс і робіць пераклічку падначаленых, абуджаючы ў памяці аповеды, нібыта ў свой час у Кітаі, гэтаксама як у Манголіі і ў вотчыне таварыша Кім Ір Сэна, сябры саюзаў пісьменьнікаў ураньні зьбіраліся разам у сваіх офісах, па званку сядалі за скарбовыя сталы і на працягу васьмігадзіннага працоўнага дня з законным перапынкам на абед пісалі літаратурна-мастацкія творы. (У нашай дэлегацыі пануе поўная анархія, а каб спатрэбілася выбраць кіраўніка, я, не вагаючыся, прапанаваў бы Сьвятлану Алексіевіч — пагатоў, ладзячы пераклічкі, яна не пяратоміцца, бо ў сьпісе буду адно я.)

Трэцяя падзея — сустрэча ў кулюарах з братняй расейскай дэлегацыяй. Млявая рука А.А.Вазьнясенскага. Ветлівая стома Андрэя Бітава. Гаркавая мудрасьць гэбрайскіх вачэй Грыгорыя Бакланава. «Старшие сестренки» паводзяцца больш непасрэдна. «Вы представляете, — трагічна ўсклікае паэтка Юнна Морыц, — даже белорусов поселили в «Атриуме», а мы вынуждены ютиться в русском посольстве, где из удобств только задрипанный чайник с пачкой сосисок в холодильнике!» (Жахлівая дыскрымінацыя, дарэчы, узьнікла зусім не таму, што чэхі вырашылі парахавацца за старыя крыўды — месцы ў гатэлі рэзэрваваліся для двух афіцыйных дэлегатаў ад кожнае краіны, з Расеі ж прыбыла каманда ў дзесяць разоў большая.)

З пачуцьцём глыбокага задавальненьня «даже беларусы» заўважаюць на даляглядзе знаёмую постаць прэзыдэнта Ўкраінскага ПЭНу пана Яўгена Сьвэрсьцюка (у недалёкім мінулым — сем гадоў лягеру і пяць — ссылкі). За ім вырастае магутны Кнут Скуеніекс, прэзыдэнт Латвійскага ПЭН-цэнтру, таксама колішні дысыдэнт і вязень брэжнеўскіх палітзонаў. Упершыню з Кнутам мы сустрэліся ў сакавіку 1989-га на шаўчэнкаўскіх урачыстасьцях у Кіеве, дзе тады яшчэ верхаводзіў таварыш Шчарбіцкі і куды мы з Рыгорам Барадуліным зьявіліся зь вялікімі бел-чырвона-белымі значкамі, за што нас разам зь яшчэ больш небясьпечнымі прыбалтамі і гадаванцам Кіеўскага ўнівэрсытэту малдаванінам Барысам Марыянам (на вакзале яго ад імя юбілейнага шаўчэнкаўскага камітэту сустракаў былы аднакурсьнік, які некалі напісаў на Барыса данос у ворганы) пасадзілі ў апошні рад велічэзнага прэзыдыюму ў залі опэрнага тэатру. Там, у глыбіні сцэны, быў выдатны назіральны пункт — асабліва тады, калі ў час прамовы Шчарбіцкага ў рампе выбухнула лямпачка й высьветлілася, што за кулісамі хавалася цэлая рота шыракаплечых рабочых сцэны ў гарнітурах ад аднаго краўца.

У Шаўчэнкавым вішнёвым садку Кнут апавядаў нам, што гэтак дасканала авалодаў расейскай і ўкраінскай у лягерох: першай — дзякуючы Сіняўскаму і Даніэлю, а другой — ці не самому Васілю Стусу. Чаму ў тых мясьцінах у яго не было настаўнікаў беларускай — пытаньне асобнае.

### *Зацемкі з праграмы 61-га сусьветнага кангрэсу міжнароднага ПЭН-клюбу*

Для мяне кангрэс пачынаецца з таго, што нечыя сталёвыя рукі ашчадна падхопліваюць мяне ззаду пад пахі і, як шахматную фігуру, перастаўляюць на паўмэтра ўбок. Па зладжаным такой мэтодаю праходзе спружыніста ўзьбягае на сцэну й кажа адтуль прывітальную прамову Вацлаў Гавэл. Паміж іншага дэлегатам прапануецца гісторыя пра прэзыдэнтавага сябра, які адмовіўся заняць высокую дзяржаўную пасаду, спаслаўшыся на тое, што хоча захаваць свабоду творчасьці. «Хто ж будзе гарантаваць гэтую свабоду, калі ўсе мы возьмем зь яго прыклад?» — пытаецца прэзыдэнт і глядзіць у залю, дзе ягоная апэляцыя не выклікае прыкметнага энтузіязму. Магчыма, прычына ў тым, што ці не палова крэслаў апанаваная дэлегатамі з жоўтай скураю. (Дадайце сюды колькі радоў з афрыканскімі калегамі, сярод якіх прымайстраваўся яшчэ незнаёмы мне, падобны да апранутага ў бялютка-сьнегавы гольф баксёра-прафэсіянала пасланец Бэніну, ад якога мне, пакутуючы ад вусьцішных падазрэньняў, давядзецца напрыканцы кангрэсу зацкавана хавацца ў нумары.

Выступы, што прагучаць у канфэрэнц-залі «Атрыюму», а таксама на сэмінарах, «круглых сталах» і вэрнісажах «Small Languages, Great Literature», «Alternatives to State Support for Books and Literature», «Faces from the History of the PEN Club» etc. (Do you understand? Калі не, дык вучыце ангельскую) будуць зьмяшчаць процьму разумных (і ня вельмі) думак і заклікаў да талерантнасьці й яднаньня інтэлектуалаў усіх краін і народаў. У атмасфэры паседжаньняў будзе прысутнічаць адчувальная нялюбасьць да сэрбаў. Фіны прапануюць рэзалюцыю ў падтрымку правоў трансыльванскіх вугорцаў. «Нашы» сярэднеазіяты пашыраць праекты рэзалюцыяў аб стварэньні сваіх нацыянальных ПЭН-цэнтраў, але чамусьці толькі на расейскай мове, якую большая частка дэлегатаў не разумее без усялякіх намаганьняў, а меншая не разумее, прыкладаючы пэўныя высілкі. Хтосьці запатрабуе катэгарычна забараніць любыя публікацыі з фашыстоўскай начынкаю. Хтосьці абвергне гэтую прапанову, і я

# THERE ARE MORE THINGS

Хорхе Луіс Борхес



*Памяці Хаўарда П. Лаўкрафта*

Якраз перад тым, як здаць апошні экзамэн ва Ўнівэрсытэце штату Тэксас, у Остыне, я даведаўся, што мой дзядзька Элвін Арнэт памёр ад анэўрызму, на далёкай ускраіне Кантынэнту. Я адчуў тое, што мы адчуваем, калі нехта памірае: прыкрасьць, зрэшты ўжо беспатрэбную, ад таго, што нам нічога б не каштавала быць лепшымі, чым мы былі. Чалавек забываецца: ён мёртвы, што гаворыць зь мёртвымі. Прадметам, што я вывучаў, была філязофія; я прыгадаў, як мой дзядзька, ня згадваючы ніводнага ўласнага імя, адкрываў мне яе цудоўныя перабліты, там у Чырвоным Доме, пад Узгор'ем. Апэльсін з дэсэртнага стала быў яму інструмэнтам каб пазнаёміць мяне зь ідэалізмам Бэрклі; шахматнай дошкі яму хапіла на парадоксы элеатаў. Пазьней ён падзеліцца са мною трактатамі Хінтана, дзе даводзіцца рэальнасьць чацьвертага вымярэньня прасторы, якое чытач можа адчуць пры дапамозе складаных практыкаваньняў з каляровымі кубікамі. Я не забудуся пра піраміды й прызмы, якія мы ўзводзілі на падлозе ў кабінэце.

Мой дзядзька быў інжынэрам. Перш чым выйсьці на пэнсію з сваёй пасады на Чыгунцы, ён пастанавіў пасяліцца ў Турдэры, што абяцала яму выгоды амаль вясковай адзіноты і адначаснай блізкасьці да Буэнас-Айрэса. Архітэктара ня трэба было доўга шукаць — ім быў выбраны блізкі дзядзькаў сябар Александар М'юр. Гэты суворы чалавек вызнаваў суворае вучэньне Нокса; мой дзядзька, на манэр амаль усіх паважных людзей сваёй эпохі, быў вальнадумцам, а лепш сказаць, агностыкам, аднак яго цікавіла тэалёгія, як цікавілі яго зманлівыя кубікі Хінтана або ладна складзеныя жахі маладога Ўэлса. Яму падабаліся сабакі; ён трымаў вялізнага аўчара, якому даў мянушку Сэмюэл Джонсан на памяць аб Лічфілдзе, яго далёкім родным мястэчку.

Чырвоны Дом стаяў на ўзвышшы, з захаду да яго падступалі паплавы. Араўкарыі за загароджай не разьвейвалі змрочнасьці яго выгляду. Замест пляскатай страхі ён меў двухсхільны шыфэрны дах і квадратную вежу з гадзіньнікам, якія, здавалася, душылі сьцены і ўбогія вокны. У дзяцінстве я прызвычаіўся да гэтых брыдотаў, як можна прызвычаіцца да тых несумяшчальных рэчаў, якія толькі з прычыны свайго суіснаваньня носяць імя сусьвету.

Я вярнуўся на бацькаўшчыну ў 1921 годзе. Каб пазьбегнуць судоў, дом прадалі з аўкцыёну; яго набыў нейкі чужынец, Макс Прэторыюс, які заплаціў удвая болей, чым запрапанаваў найлепшы пакупнік. Калі акт быў падпісаны, ён прыехаў надвячоркам з двума памагатымі і яны пазвальвалі ў канаву, непадалёк ад Вайсковай Дарогі, усю мэблю, усе кнігі і ўсе рэчы з дому. (Я з жалем згадваю дыяграмы ў тамох Хінтана й вялікі глёбус.) На другі дзень ён прыйшоў пагаварыць з М'юрам і запрапанаваў яму сёе-тое перабудаваць, ад чаго той з абурэньнем адмовіўся. Праз нейкі час неабходныя працы ўзялася зрабіць нейкая сталічная фірма. Мясцовыя цесьляры адмовіліся мэбляваць дом нанова; урэшце нейкі Марыяні, з Глеў, згадзіўся на ўмовы, што прапанаваў яму Прэторыюс. Поўмесяца ён мусіў працаваць начамі, за зачыненымі дзьвярыма. І таксама ўночы асталяваўся ў Чырвоным Доме яго новы насельнік. Вокны ўжо болей не расчыняліся, але ў цемры іх дзялілі напалам



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



ўзгадаю, што дагэтуль ня змог з прафэсійнае цікавасьці прачытаць «Mein Kampf», што, мабыць, ня робіць беларускаму літаратару вялікага гонару.

Салман Рушдзі, якому ў «Атрыюме» дзеля канспірацыі забранявалі, кажуць, адразу тузін нумароў, вырашыў канчаткова зьбіць сваіх забойцаў з панталыку і зусім не прыехаў. Праўда, высланыя ў Прагу ісламскімі фундамэнталістамі кілеры атрымалі годную замену ў асобе пісьменьніцы з Бангладэш Тасьлімы Наерын, якую на радзіме асудзілі на сьмерць за творы супраць карану. Тасьліма ўражвае публіку сваімі ўсходнімі строямі й жывым кольцам з чатырох-пяці целаахоўнікаў. Яна заяўляе, што жанчынаў прыгнятаюць у любой рэлігіі, але ў ісламе — асабліва. Калега з Фінляндыі, экспансыўная былая грамадзянка СССР зь пятым пунктам перакладае мне вершы адважнай бангладэшкі на расейскую: «Сестра моя, женщина! Вот идет мужчина. Не смотри на него. Он — твой враг. Он может заразить тебя сифилисом...»

У крэсьле побач са мною маладая чарнявая харватка, што, як выявілася ў час сьняданьня, ведае колькі дзясяткаў расейскіх слоў. Пераклад верша пра небясьпечнага ісламскага мужчыну дае неблагі шанец працягнуць знаёмства ў пэрспэктыўным рэчышчы размовы аб жанчынах дэмакратычнай краіны Харватыі, аднак мая суседка нечакана кажа, што «сербы убивал ее брат», і ў агатавых вачах западае смутак, які робіць усе магчымыя варыянты абсалютна безнадзейнымі.

### *Зацемкі з канцэртнае праграмкі вечару ў джаз-клюбе «Radost»*

Музыкі ў джаз-клюбе я так і не паслухаў, бо, пакінуўшы «Атрыюм», праз колькі сотняў крокаў трапіў у абладу іншае музыкі — каменнай, якая прадстаўленая тут ці ня ўсімі сваімі эўрапейскімі жанрамі й стылямі. Спадзяюся, што чытач таксама будзе некалі ісьці над Влтавою, а таму ня стану ладзіць экскурсіяў. Скажу толькі пра асабістае: на Старамескім пляцы, пасьля спатканьня з масянжовым Янам Гусам у шляхетнай апратцы з паціны, прагуляўшыся ўсьцяж дзейнага філіялу цэха сярэднявечных кавалёў у амэрыканскіх джынсах і турэцкіх швэдрах і зьеўшы на стаянцы раскошных фаэтонаў першы ў жыцьці кулёчак гарачых каштанаў, я ледзьве ня нос у нос сутыкнуўся з сваім, мабыць, адзіным на сьвеце цёзкам.

Пра этымалёгію беларускага найменьня Арлой айчынная прэса ўжо паведамляла: яго хросная матка — паштарка з нашага аддзяленьня сувязі, якая — ці кол ёй на галаве чашы, ці стукні па цемечку магітафонам «Panasonic» — «ў» чытае як «й».

Праскі Арлой (этымалёгія засталася для мяне загадкаю) — стварэньне шматкроць больш дасканалае за менскага. Ён ня сварыцца з паштаркаю, ня жлукціць чырвонага віна і не псуе паперы. Здаецца, ён абыякавы да жанчынаў (хоць і не належыць да сэксуальнай меншасьці), калі ў тэлевізары зьяўляецца ягоны прэзыдэнт, цёзку не наведвае неадольнае жаданьне намацаць рукою прас.

Праскі Арлой утульна й выгодна ўладкаваўся пяць стагодзьдзяў таму на ратушы, адкуль спраўна паказвае час, робячы гэта з дапамогаю сьвятых апосталаў ды ўсьмешлівага шкілету зь пясочным гадзіньнікам, што ў патрэбны момант торгае за шнурок і засяроджана лічыць мэлядычныя ўдары.

Менскі Арлой сьцішана зайздросьціць праскаму і са сьветлай думкаю пра тое, што здарыцца праз пяць стагодзьдзяў зь ім, недасканалым менскім Арлоем, залагоджвае смакавыя рэцэптары кавою капучына.

### *Зацемкі з запрашальніка на прыём да прэм'ер-міністра Вацлава Клаўса*

У чым я абсалютна ўпэўнены па дарозе ў Ліхтэнштэйнскі палац (мая дэмакратызацыя зайшла настолькі далёка, што гальштук застаўся ў гатэлі забаўляць пакаёўку), дык гэта ў тым, што прэм'ерміністар Рэспублікі Беларусі (нават калі ім стане хтосьці з былых сяброў, якія аддрэйфавалі ў вялікую палітыку) мяне на прыём (прынамсі, у гэтым стагодзьдзі) ніколі не запросіць. Ня тая, перапрашаю за выраз, мэнтальнасьць.

Дарэчы, пра мэнтальнасьць. Малады ўкраінскі калега Володымыр Цыбулька (ён прыбыў у Прагу на перакладных, ня маючы грошай на зваротны шлях, аднак ужо пасьпеў раскалоць амэрыканскага «спонсара» й засьведчыць, што ставіцца да расейскіх дэлегатаў, далікатна кажучы, без празьмернага піэтэту) падлівае мне мараўскага чырвонага й ненавязьліва зьвяртае маю ўвагу на паводзіны маскоўскае каманды. Трэба аддаць Валодзю

*Працяг на старонцы 14*



вузкія расколіны сьвятла. Аднойчы раніцай малочнік знайшоў на сьцежцы мёртвага аўчара, зьнявечанага й без галавы. Узімку звалілі араўкарыі. Ніхто болей ніколі ня бачыў Прэторыюса, які, па ўсім відаць, пасьпяшаўся пакінуць гэты край.

Гэткія весткі, як і трэба было чакаць, занепакоілі мяне. Я ведаю, што мая самая характэрная рыса — цікаўнасьць, якая часам прыводзіла мяне да сувязі з зусім чужою мне жанчынай, толькі каб даведацца хто яна й якая яна, да спробаў ужываць (без істотных вынікаў) опіюм, да вывучэньня трансфінітных лікаў і да тае жахлівае прыгоды, пра якую я зараз распавяду. На сваё няшчасьце я вырашыў высьветліць гэтую справу.

Маім першым захадам была сустрэча з Александрам М'юрам. Я памятаў яго зграбным і смуглым, за ягонай хударлявасьцю хавалася сіла; цяпер жа ён быў сагнуты гадамі, а ягоная чорная барада пасівела. Ён прыняў мяне ў сваім доме ў Тэмпэрлі, які, як і трэба было чакаць, быў падобны да дому майго дзядзькі, дзеля таго што абодва адпавядалі салідным нормам добрага паэта й кепскага будаўніка Ўільяма Морыса.

Размова была нешматслоўная; нездарма сымбалем Шатляндыі лічыцца дзядоўнік. Тым ня менш, я адчуў, што моцная цэйлёнская гарбата й шчодрая порцыя аладак (якія гаспадар рэзаў і мазаў маслам, нібы я ўсё яшчэ быў малым хлопчыкам) былі ў сапраўднасьці сьціплым пратэстанцкім банкетам у гонар пляменьніка ягонага сябра. Ягоныя тэалягічныя спрэчкі з маім дзядзькам былі вялікай шахматнай партыяй, якая патрабавала ад кожнага гульца супрацоўніцтва з супернікам.

Час мінаў, а я не набліжаўся да сваёй тэмы. Настала няёмкае маўчаньне, а пасьля М'юр загаварыў:

— Хлопча (Young man), — сказаў ён, — вы прыехалі сюды не на тое, каб мы гаварылі пра Эдвіна або пра Злучаныя Штаты, краіну, якая мала мяне цікавіць. Вам не дае спакою продаж Чырвонага Дому й яго дзіўны пакупнік. Мне таксама. Шчыра кажучы, мне гэтая гісторыя не падабаецца, аднак я скажу вам усё, што магу. Скажу зусім няшмат.

Праз хвіліну ён нясьпешна працягваў.

— Перад тым, як памёр Эдвін, адміністратар запрасіў мяне ў свой кабінэт. Зь ім быў парафіяльны сьвятар. Яны запрапанавалі, каб я накрэсьліў пляны каталіцкай капліцы. Абяцалі добра мне заплаціць. Я адразу ім адказаў не. Я слуга Госпада й не магу ўчыніць гнюснасьць і збудаваць алтар для ідалаў.

Ён спыніўся.

— Гэта ўсё? — наважыўся я запытацца.

— Не. Гэты жыдок Прэторыюс хацеў, каб я разбурыў свой твор і на ягоным месцы зьляпіў нешта пачварнае. Гнюснасьць можа мець розныя формы.

Ён вымавіў гэтыя словы вельмі паважна і ўстаў.

Калі я павярнуў за рог, да мяне падыйшоў Даніэль Ібэра. Мы былі знаёмыя, як бываюць між сабой знаёмыя людзі ў вёсках. Ён запрапанаваў мне прагуляцца пехатою. Мяне ніколі не цікавілі крымінальнікі, і я прадбачаў чараду брыдкіх апавяданьняў, больш ці менш апакрыфічных і жорсткіх, аднак я махнуў рукой і згадзіўся. Было ўжо амаль зусім цёмна. Пабачыўшы за якую сотню мэтраў на ўзгорку Чырвоны Дом, Ібэра перадумаў ісьці далей. Я спытаўся ў яго чаму. Адказ ягоны быў зусім неспадзяваны.

— Я — правая рука дона Фэліпэ. Ніхто ніколі мяне не называў баязьліўцам. Успомні пра таго тыпа Ургоіці, які прыцёгся з Мэрло са мной разьлічыцца, і што зь ім было. Дык вось. Неяк уночы ехаў я з адной гулянкі. За якіх сто мэтраў ад маёнтку я нешта пабачыў. Мой конік спалохаўся, і калі б я ня джыгнуў яму й не ўтрымаўся на дарозе, тады б ці мы з табой тут гаварылі. Што я пабачыў, мне мала не здалося.

Вельмі раззлаваны, ён вылаяўся.

Гэтай ноччу я ня спаў. Пад раніцу я прысьніў гравюру, нібы ў манэры Піранэзі, якую ніколі ня бачыў або бачыў і забыўся, на ёй быў лябірынт. Гэта быў каменны амфітэатр, абсаджаны кіпарысамі й вышэйшы за вяршаліны кіпарысаў. У ім не было ні дзьвярэй, ні вокнаў, а толькі бясконцы рад вузкіх вэртыкальных

*Працяг на старонцы 14*



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# Нумар зь відам на Градчаны

*Працяг з старонкі 13*

належнае: велізарны асётар, гэтаксама як і смажанае малочнае парася, пакуль мы лыпалі вачыма ды жывіліся трошкі большымі за колішнія мэталёвыя рублі лусьцікамі, сапраўды незваротна зьніклі найперш дзякуючы згуртаваным маскоўскім байцам. (Між іншым, калі даваць веры вынікам зганага напачатку сацыялягічнага дасьледаваньня, дык у рэйтынгу суседзкае папулярнасьці ў патыліцу расейцам дыхаюць якраз украінцы.) Урэшце, ня варта ідэалізаваць і пасланцоў вольнага сьвету: вярнуўшыся з кубачкамі кавы да свайго століка, мы з панам Цыбулькам бачым, як двое паўднёвакарэйскіх калегаў аплятаюць упрыкуску з чорным хлебам нашыя цестачкі, балзёра запіваючы экзатычнае славянскае едзіва віном з нашых келіхаў.

У міжнароднага сакратара ПЭН-клюбу спадара Алекса Блока манэры іншыя. Мы абменьваемся некалькімі ветлівымі фразамі па-расейску, бо ён з расейскіх эмігрантаў і ягонае сапраўднае імя — Аляксандар Блок.

Калі верыць карткам гасьцей і дэлегатаў кангрэсу, дык побач з намі робіць птушыны глыток з вузкага келіху нэрвовая румынка Анна Бландыяна, аўтарка бліскучых навэлаў і цудоўнага эсэ пра вольных дэльфінаў, напісанага аднойчы пасьля вяртаньня з салёну мадам Чаўшэску, якая, кажуць, прымала яе як родную дачку.

Чэскі прэм'ер Клаўс вырашае прысьвяціць свой вечар мяцежнай Тасьліме, што з зайздросным для асуджанай на сьмерць смакам паядае аздобленую ківі беларыбіцу...

Залітыя залаціста-зялёным сьвятлом начныя Градчаны знаходзяцца зусім побач зь лёгкадумнаю поўняй. Ад чароўнага відовішча мяне адрывае калега з Бэніну, што з грацыёзнасьцю тапіра апускаецца на аўтобуснае крэсла побач са мною, пачынаючы зьвіваць вяровачку сюжэту, які пагражае скончыцца для мяне дзенебудзь у экватарыяльных джунглях.

### *Зацемкі з квітка ў тэатральную кавярню «Viola»*

У гэтай кавярні з амфітэатрам столікаў адбываецца вечарына сучаснай расейскай паэзіі. Прадстаўнік гаспадароў зь нечакана ўсходнеславянскім — хоць прыкурвай — носам папярэджвае паэтаў, што будзе даваць слова паводле чэскага альфабэту і ня болей чым на пяць хвілінаў.

Юнна Морыц з артыстычным надрывам чытае пра тое, што

Когда мы были молодыми,
И чушь прекрасную несли,
Фонтаны были голубыми,
И розы красные цвели.

«Даже белорусы» паважаюць паэтку Ю.Морыц, нават тады, калі яна жыве не ў шыкоўным гатэлі, а — з задрыпаным чайнікам і зьвязкаю сасісак у расейскім пасольстве. (Гэта не перашкодзіць нам аднаго разу досыць падрабязна пазнаёміць яе з мэню нашага сьняданку.)

Яўгені Рэйн (эвангеліст Лука, якім ён мне заўсёды ўяўляўся, у сучасным эўрапейскім гарнітуры) дэклямуе добрыя вершы пра рымскую барахолку.

«Чтобы вы поняли, как я деградировал, — заяўляе А.А.Вазьнясенскі, — вначале я почитаю старые стихи». Старыя тэксты сапраўды ўражваюць больш за новыя, нават і тады, калі далучыць да іх разьвешаныя ў фае парыскія відэомы, сярод якіх добрым веданьнем натуры вылучаецца попка, прапанаваная воку на асноведзі нейкіх дзьвярэй ад Кардэна.

### *Зацемкі зь візытоўкі былога футбаліста вышэйшай лігі, а цяпер паэта й рэдактара маскоўскага часопісу*

Сустрэча зь філёлягамі Карлавага ўнівэрсытэту. Сюды запрасілі беларусаў і ўкраінцаў, а колішні футбаліст узьнік побач ні з пушчы ні з поля — як быццам недзе на ўзроўні СНД было вырашана: «белоруссов и малороссов без присмотра не оставлять».

Папярэдне вызначаная тэма — «ваенная проза», таму галоўнай дзейнай асобаю робіцца Сьвятлана Алексіевіч зь яе жанчынамі зь першай кнігі і цынкавымі хлопчыкамі з апошняй. (Мы яшчэ ня хочам здагадвацца, што праз месяц пастаўшчыкі цынкавых трунаў зноў запусьцяць свой зьлёгку заржавелы канвэер на поўную магутнасьць.) Гаворка йдзе пра два погляды на другую сусьветную вайну — з Захаду і з Усходу, пра тое, што чалавечае жыцьцё ня можа быць роўнае ні трактару, ні танку, ні цэлай дзяржаве; пра беларускую партызанщчыну (чэхі, якія да траўня 1945-га ў немцаў практычна не стралялі, далікатна ня ўпэўненыя, што для нашай нацыі гэта быў найлепшы шлях самазахаваньня).

Маскоўскі калега адчувае сябе пакрыўджаным і рашуча цягне коўдру на сябе. Для пачатку ён паведамляе прысутным, што яны могуць не хвалявацца: усё адно раней ці пазьней Расея, Беларусь і Ўкраіна будуць разам. Прамоўцу відавочна смажыць. Асушыўшы бутэльку тоніку, ён працягвае палітінфармацыю, прычым сярод палітычных тэрмінаў усё больш годнае месца займаюць лексэмы «хрен» і «говно», у выніку чаго студэнтачкі заліваюцца цнатлівым філялягічным румянкам.

Атрымаўшы слова, я кажу пра Ларысу Геніюш, якая выдала ў Празе сваю першую кнігу, пра Францішка Скарыну, пра магістра Геранімa Праскага і яго казані ў Вільні й Віцебску, пра пяць тысячаў беларусінаў, якія бралі ўдзел у гусіцкіх войнах і пра тое, што якраз дзеля барацьбы з пасьлядоўнікамі Яна Гуса ў 1436 годзе ў Вялікім Княстве Літоўскім была ўведзеная інквізыцыя, дзейнасьць якой, праўда, трывала ў нас усяго 43 гады. Пытаньні да мяне не зусім па тэме: Колькі ў Менску цалкам беларускамоўных школаў? Няўжо гэта ня плёткі, што беларускі прэзыдэнт ня ўмее гаварыць па-беларуску і не выпускае на людзі жонку? Адказы вядомыя.

Мы ледзьве пасьпяваем агульнымі намаганьнямі залагодзіць сытуацыю, як былы форвард зноў дае сабе слова дзеля выступу ў іпастасі рыфмара. У працэсе дэклямацыі ён, згадаўшы спартовае юнацтва, робіць усім корпусам імпэтныя рухі, стукае кулаком па стале і ўрэшце перакульвае поўную бутэльку з тонікам, утвараючы на стальніцы вялікую лужыну з абрысамі Чорнага мора, на берагах якога некалі вучыўся стукаць па мячыку й лаяцца матам.

Назаўтра я сустракаю яго ў гатэльным калідоры зь юным стварэньнем, якое маэстра, прапусьціўшы доўгія ножкі наперад, рэкамэндуе мне як «девочку на ночь». Пра тое, што яна дазволіла рабіць з сабою, я стараюся ня слухаць. Мне здаецца, што такія рэчы павінны заставацца таямніцаю для дваіх і ў тым выпадку, калі адна з гэтых дваіх — «девочка на ночь».

### *Зацемкі з запрашальніка на «круглы стол» «Franz Kafka — Trial and Metamorphosis»*

Замест «круглага стала» мы зь Сьвятланаю ў суправаджэньні прафэсара Карлавага ўнівэрсытэту й галоўнага чэскага беларусіста пана Вацлава Жыдліцкага (некаторыя кнігі Ўладзімера Караткевіча ў Празе выйшлі раней, чым у Менску) ідзем на старажытны жыдоўскі могільнік, які чэхі захавалі ў самым сэрцы Старога Места. Няхай ахвочыя вінавацяць мяне ў чым заўгодна, але гэтыя могілкі — адно з маіх наймацнейшых праскіх уражаньняў. Хаваць тут пачалі ў XV стагодзьдзі, а апошняе надмагільле датаванае 1787 годам, і, калі блукаеш па зацярушаных кляновым лісьцем вузенькіх сьцежках сярод дванаццаці тысячаў сьпярэшчаных гэбрайскімі пісьмёнамі плітаў, міжволі й сам у закутку душы робісься гэбраем.

Менавіта адсюль найлягічней выправіцца ў блізкі музэй аўтара «Замка» й «Працэсу», каб, сустрэўшы ў доме, дзе ён жыў, строгія фотаздымкі з гэбрайскімі абліччамі, графічныя й скульптурныя партрэты і храналягічныя табліцы, пагадзіцца, што зыбку, дзе Франак сікаўся, келіх, зь якога піў, стол, за якім пісаў, гэтаксама, як і наш «круглы стол» зусім няцяжка прыдумаць, як табе падабаецца.

### *Зацемкі з чыстай старонкі ў кнізе «Czech Writers on Tolerance»*

Яны прысьвечаныя візыту на іншыя праскія могілкі — Альшанскія, куды нас вядзе пан Міласлаў Зіма, што гаворыць па-беларуску лепей, прынамсі, за двух нашых народных пісьменьнікаў.

Сьцьвярджаюць, што гэта адзін з найбуйнейшых нэкропаляў расейскае эміграцыі. Цэлы шыхт «белых» генэралаў. Маці Набокава. Куток казацкіх палкоўнікаў.

Каля праваслаўнае царквы ў стылі пскоўска-наўгародзкіх храмаў знаходзім беларускія магілы: справа — прэзыдэнта БНР Пётры Крэчэўскага, зьлева — жонкі яшчэ аднаго прэзыдэнта Васіля Захаркі з такой самай «Пагоняю» на помніку. Да помніка прыхінутая замшэлая плітка, дзе даты жыцьця самога прэзыдэнта Захаркі расчытаць ужо немагчыма. (Міжволі ўзгадваюцца бачаныя ўчора дагледжаныя жыдоўскія магілкі XVII і XVIII стагодзьдзяў.) Праз якіх пару крокаў — сьвежая пліта: Міхаіл Забэйда-Суміцкі.

Як на мой кансэрватыўны беларускі густ, дык я ўсё ж выбраў бы самую занядбаную магілку, а ня цацачную вазачку за акенцам тутэйшай сьцяны-калюмбарыю (яна чамусьці нагадвае мне батлейку) і, пагатоў, ня чысты зялёны лужок без

# THERE ARE MORE THINGS

*Працяг з старонкі 13*

адтулінаў. З павелічальным шклом я спрабаваў вышукаць мінатаўра. Нарэшце я яго заўважыў. Ён быў страхоцьце з страхоцьцяў; у ім было больш ад бізона, чым ад быка, і, разьлёгшыся на зямлі чалавечым тулавам, ён, здавалася, спаў і сьніў сон. Што або каго ён сьніў?

Тым вечарам я прайшоўся перад Домам. Весьніцы ў агароджы былі замкнутыя, а пару прутоў выкручаныя. Тое, што некалі было садам, парасло хмызьняком. Справа была неглыбокая яма з вытаптанымі берагамі.

Мне засталося зрабіць адзін крок, які я затрымваў некалькі дзён, ня толькі таму, што адчуваў яго зусім дарэмным, але й таму, што ён вёў мяне да непазьбежнага, да апошняга.

Безь вялікіх спадзяваньняў я накіраваўся ў Глеў. Цясьляр Марыяні быў тоўсты ружовы італьянец, ужо немалады, а дзеля таго больш просты й сардэчны. Варта мне было яго пабачыць, як я адмовіўся ад усіх сваіх хітрых плянаў, распрацаваных напярэдадні. Я падаў яму сваю візытоўку, якую ён урачыста ўголас расчытаў па складах, з павагаю спатыкнуўшыся на слове доктар. Я сказаў яму, што мяне цікавіць мэбля, якую ён вырабіў для былога маёнтку майго дзядзькі ў Турдэры. Чалавек гаварыў і гаварыў. Я ня буду спрабаваць перадаць на паперы ягоныя шматлікія й падмацаваныя жэстамі словы, аднак ён заявіў, што ягоны дэвіз — задавальняць усе патрабаваньні кліента, якімі б вар'яцкімі яны ні былі, і што ён выканаў сваю працу з дакладнасьцю да апошняй рыскі.

Пакорпаўшыся ў розных шуфлядах, ён паказаў мне нейкія паперы, у якіх я нічога не зразумеў, падпісаныя няўлоўным Прэторыюсам. (Ён, напэўна, прыняў мяне за адваката.) Разьвітваючыся, ён мне прызнаўся, што за ўсё золата сьвету ніколі болей ня вернецца ў Турдэру, а пагатоў у той дом. Вядома, кліент — справа сьвятая, дадаў ён, але як на ягоную недастойную думку, дык спадар Прэторыюс быў вар'ят. І ён адразу замаўчаў, пашкадаваўшы аб сказаным. Больш зь яго я нічога выцягнуць ня мог.

Я быў прадбачыў гэтую няўдачу, але адна справа прадбачыць, а другая як яно выходзіць у рэальнасьці.

Колькі разоў я казаў сабе, што няма іншай таямніцы, як час, бясконцае перапляценьне ўсіх гэтых учора, сёньня, заўтра, заўсёды й ніколі. Гэтыя глыбокія развагі не прынесьлі ніякай карысьці; прысьвяціўшы вечар студыяваньню Шопэнгаўэра або Ройса, я зноў ноч за ноччу хадзіў па сьцежках вакол Чырвонага Дому. Часам я заўважаў ярчэйшае сьвятло, іншым разам мне чуўся нейкі стогн. Так цягнулася да дзевятнаццатага студзеня.

Гэта быў адзін з тых буэнас-айрэскіх дзён, калі чалавек адчувае сябе ня толькі пакрыўджаным і абражаным летняй сьпёкай, але проста прыніжаным да немагчымага. Была адзінаццатая гадзіна ўвечары, калі выбухнула навальніца. Спачатку паўдзённы вецер, а за ім патокі вады. Я блукаў, шукаючы дрэва. У імгненным бляску маланкі я заўважыў, што стаю за пару крокаў ад агароджы. Ня ведаю, зь якім страхам або надзеяй я намацаў весьніцы. Неспадзявана, яны падаліся. Я ўвайшоў, штурханы бураю. Неба й зямля пагрозьліва мяне папярэджвалі. Дзьверы ў дом таксама былі прачыненыя. Пошуг дажджу секануў мне ў твар, і я ўвайшоў.

Унутры пліткі падлогі была вывернутыя, і я ступаў па неахайным дзірване. Дом быў напоўнены салодкім і млосным пахам.



Зьлева або справа, дакладна ня ведаю, я натыкнуўся на каменныя сходы. Пасьпешліва падняўся. Амаль мімаволі я павярнуў выключальнік.

Сталовая й бібліятэка з маіх успамінаў, сьцяна паміж якімі цяпер была разбураная, былі адным вялікім спустошаным пакоем, дзе сям-там стаяла нейкая мэбля. Я ня буду спрабаваць яе апісаць, бо я ня пэўны, што яе бачыў, асьлеплены няшчадным белым сьвятлом. Я растлумачу. Каб бачыць нейкую рэч, трэба яе разумець. Фатэль прадугледжвае чалавечае цела, яго суставы й канечнасьці; нажніцы — акт рэзаньня. Што можна сказаць пра лямпу або аўтамабіль? Дзікун ня можа спасьцігнуць біблію місіянэра; падарожнік бачыць ня тую самую аснаду, што матросы. Калі б мы рэальна бачылі сусьвет, тады б мы яго зразумелі.

Ніводная зь бязглуздых формаў, якія паказала мне тая ноч, не адпавядала чалавечай постаці або нейкаму разумнаму ўжытку. Я адчуў агіду й страх. У адным



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



усялякіх апазнавальных знакаў, над якім нядаўна разьвеялі прах жонкі нашага правадніка.

*Зацемкі з праграмы паездкі на міжнародны фэстываль «Divadlo-94» у Пльзэні*

Тлумачу: divadlo — гэта па-чэску тэатар. Музыка — гудба, а, напрыклад, мэдыятар — грашка. Перад намі спадчына аднаго з прынцыпаў чэскага адраджэньня. Мы заварушыліся пазьней, і вось вынік: маем мэдыятар. Але тэатральны балкон у чэхаў усё-такі — балкон, і якраз на ім дэлегаты кангрэсу дзеляцца ўражаньнямі ад толькі што ўбачанага спэктаклю паводле «нехорошей» п'есы «Салавей на вячэру», доўгі час забароненага і ў нас і на радзіме, у Чэхіі, Ёзэфа Топаля. Трэба адразу сказаць, што «Салаўя» забаранялі цалкам заслужана: ну што магла сказаць розуму й сэрцу савецкага чалавека гнюсная гісторыя пра гнілую інтэлігенцкую сямейку (ці, дакладней, зграю), якая завабіла да сябе госьця, каб пасьля розных інтэлектуальных выкрунтасаў зьесьці яго?

Гэтую шкодніцкую дысыдэнцкую штучку мы мелі гонар глядзець у цёмнай пустой залі проста са сцэны, дзе гасьцям паставілі колькі дзясяткаў крэслаў, паабяцаўшы нікога ня зьесьці.

Цяпер заля запоўненая публікаю, а на сцэне пачынаецца адкрытая дыскусія Вацлава Гавэла зь ягонымі даўнімі сябрамі Артурам Мілерам і Томам Стопардам — «Not only about the Theatre».

Услухоўваючыся ў чэскую й ангельскую мовы, я ўяўляю на месцы чэскага прэзыдэнта А.Р.Лукашэнку. Ролі Мілера й Стопарда, здаецца, з аднолькавым посьпехам маглі б выконваць, ну, скажам, Умбэрто Эко з Куртам Вонэгутам. Зрэшты не, італіец Эко да вышыні патрэбнае плянкі наўрад ці лацягне, бо ў яго пэўныя праблемы з ангельскаю, а тым больш — з расейскаю. З той самай прычыны Аляксандар Рыгоравіч, відаць, адмовіцца ад публічнае дыскусіі з Габрыэлем Гарсія Маркесам ці, напрыклад, з нобэлеўскім ляўрэатам Актавіо Пасам, і давядзецца пасылаць запрашэньне Джону Фаўлзу.

Ужо двойчы згаданы калега з Бэніну, імя якога на нашай беднай мове немагчыма ні трансьлітэраваць, ні вымавіць, на дыспут зь беларускім прэзыдэнтам не прэтэндуе. Ён пахне вытанчаным мужчынскім адэкалёнам і чамусьці (хоць мы не вучыліся зь ім разам ні ў БДУ імя Леніна, ні ў Сарбоне) спрабуе ўступіць у дыскусію з мною, прычым — на вялікі жаль — па-француску. Спробы доўжацца і на вячэры ў велізарнай, быццам графская стайня, пльзэньскай рэстарацыі на слыннай тамтэйшай піваварні. У начным аўтобусе па дарозе ў Прагу ў мяне зьяўляюцца рэальныя пэрспэктывы паездкі на паляваньне ў Афрыку. Мой новы сябар гарантуе ліцэнзію на адстрэл як найменш аднаго зьвера, якога завуць элефантам, ня кажучы ўжо пра розную драбязу накшталт шакалаў і антылопаў. Пасьля вылазкі ў джунглі мы будзем вяртацца ў бунгала, дабаўляць у вялікую шклянку віскі сымбалічную кропельку содавай і размаўляць пра жанчын або плесьці фабулы новых, вартых гэтага віскі й гэтай сучаснасьці літаратурна-мастацкіх твораў. Я, прызнаюся, хачу ўдакладніць некаторыя нюансы бэнінскае буколікі, але як на тое, забываюся, як будзе па-ангельску «канібал».

У родным «Атрыюме» ў глыбокім одуме сядзіць на краі фантану паэт Валодзя Цыбулька, падобны да павялічанага ў 1,5 раза і прыкладна ў стольки ж разоў цьверазейшага паэта Анатоля Ціханавіча Сыса. Валодзя адмовіўся ад вандроўкі ў Пльзэнь на той законнай падставе, што пльзэньскага не бракуе і ў Празе. У сябе на бацькаўшчыне ён складае файныя вершы й займаецца раскольніцкай дзейнасьцю ў шэрагах спілкі майстроў прыгожага пісьменства. Паэтавы чаравікі спачываюць побач, наводзячы на думку, што ў дадзены момант калега вырашае кардынальную эстэтычную праблему — мыць ці ня мыць у гэтым пяцізоркавым фантане свае натруджаныя за доўгі творчы дзень ногі?

Праз нас праносіцца з пляшкаю ў руцэ маскоўскі экс-форвард. Японскія й карэйскія калегі дэлавіта вядуць у свае нумары сьветлых эўрапеоідных істотаў з цыбатымі нагамі. Я зь сьветлым сумам разумею, што й гэтую ноч у сваіх утульных чатырох сьценах з двума шыкоўнымі ложкамі мне давядзецца бавіць тэт-а-тэт зь незабыўным вобразам адной грамадзянкі Рэспублікі Беларусі, якая на адвітаньне прасіла мяне моцна ёй ня здраджваць.

Праз колькі хвілінаў высьвятляецца, што я памыляюся. У дзьверы нумару асьцярожліва стукаюць. У «вочку» я бачу маціцовую ўсьмешку дагледжаных зубоў бэнінскага сябра. З калідора чуецца ласкава-ўніклівае «Volod'ja!». Нацягваючы нагавіцы, я намагаюся адэкватна ацаніць сытуацыю. У спавітых мяккім пльзэньскім хмелем зьвілінах тоўпяцца самыя розныя непамысныя здагадкі. Трэба зь пякучым сорамам канстатаваць, што над усімі магчымымі «ізмамі», якія маглі натхніць майго чарнаскурага знаёмца на такі позьні візыт (марксізм-ленінізм, ісламскі фундамэнталізм, гомасэксуалізм...) прэвалюе халодная думка пра канібалізм.

Змабілізаваўшы свае сьціплыя веды ангельскай, я ўдавана сонным голасам заяўляю, што ўжо сплю. Гэта не аргумэнт. Стукат (а разам зь ім і зусім непатрэбныя цяпер рэмінісцэнцыі зь Ёзэфа Топаля) робіцца больш настойлівы.

«Volod'ja!»

Роспач нараджае нестандартную ідэю. «My dear friend! — сьціскаючы ў зьбялелых пальцах газавы балёнчык, адгукаюся я. — I am not alone. There's a lady with me». (У скарочаным перакладзе з маёй ангельскай гэта значыць: у мяне ў нумары дама.)

Гэта — выратаваньне.

«Sorry, — чуецца з-за дзьвярэй. — Good night!»

Перавёўшы дух, я вырашаю прыняць нанач ніштаватую порцыю старой добрай «белавескай» — і без усякіх содавых.

*Зацемкі на чыгуначным квітку «Менск-Прага», зробленыя падчас разьвітальнае праходкі*

Гэтыя зацемкі прэтэндуюць на лягічную сувязь між сабою прыкладна так, як па-лістападаўску шорсткія лісты на набярэжнай Влтавы.

Карлаў мост, калі йдзеш па ім на Градчаны, нагадвае дарогу ў чысьцец...

Кажуць, хтосьці зь дзеячоў тутэйшага нацыянальнага адраджэньня пісаў, што чэская мова канчаткова пераможа тады, калі на ёй загавораць праскія прастытуткі. Я маю моцны сумнеў, што гэты опус прачытаюць іхнія беларускія каляжанкі. Таму, калі ў вас надарыцца магчымасьць, перадайце нашым валхвіцам каханьня, што ў немалой ступені лёс нацыянальнага рэнэсансу залежыць і ад іх...

Апоўдні на Градчанах адбываецца зьмена ганаровае варты. У Гавэлавай рэзыдэнцыі зьнячэўку адчыняюцца вокны, і гарністы з бубначамі пры поўным парадзе выконваюць свае партыі, стоячы на падваконьнях. Гэта лішні раз нагадвае, што на чале дзяржавы стаіць чалавек, зьвязаны не з палітаддзелам, а з тэатрам...

У Чэхіі чалавек з адукацыяй гісторыка павінен абавязкова ўзгадаць Караледворскі рукапіс, знойдзены ў 1817 годзе на дзень сьвятой Людмілы ў касьцельнай вежы, зь якой можна было акінуць вокам увесь Двур Кралове-на-Лабе. У нас нішу стваральніка нацыянальнага эпасу меў шанцы заняць Сяржук Сокалаў-Воюш, які ўжо напісаў быў, калі не памыляюся, дзьве зь лішнім тысячы радкоў. Замест гэтага Сяржук зьехаў у Нью-Ёрк, дзе гадуе двух амэрыканскіх сыноў і, мабыць, ужо ня памятае, што я мог бы знайсьці Полацкі рукапіс на дзень Сьвятое Еўфрасіньні ў галубніцы Сафійскага сабору, дзе ён быў замураваны з часоў Усяслава Чарадзея...

*Зацемкі, пачатыя на тэлефоннай картцы з аўтапартрэтам Анры Русо й закончаныя на сурвэтцы з кавярні «Чартоўка»*

Гэтыя зацемкі трансфармаваліся ў верш, дзе ёсьць такія вось радкі:

... бэхераўка афарбуе вечар
зялёнай гамаю,
чамусьці прынесшы згадкі
пра паручніка Лукаша,
што лічыў усіх чэхаў,
якія гавораць па-чэску,
нечым накшталт карбанарыяў.
Набярэжная Влтавы
будзе філіялам
гэтага таемнага таварыства,
прапанаваўшы багатыя магчымасьці
параўнаньня праскіх ножак
з тваімі,
якія захочацца разбудзіць
у ранішнім нумары
цёплага восеньскага гатэлю,
над кавярняй
з свойскаю назвай «Чартоўка»,
дзе ў сьпісе заўсёдных кліентаў
значыцца пара лебедзяў,
што будуць цярпліва чакаць,
пакуль мы пакінем
яхту нашага ложку,
спусьціўшыся на прыстань,
дзе можна карміць белых птушак,
замаўляючы бурштынавае віно,
пакуль Градчаны
не паплывуць па-над местам,
як славянскія думкі
Влтавы.

*Лістапад 1994 — люты 1995.*

з кутоў я заўважыў вэртыкальную лесьвіцу, што вяла на другі паверх. Паміж шырокімі прыступкамі, якіх было ня больш за дзесяць, былі неаднолькавыя прагалы. Гэтая лесьвіца, якая прадугледжвала йснаваньне рук і ног, была зразумелая й неяк мяне супакоіла. Я згасіў сьвятло й счакаў нейкі час у цемры. Я не пачуў ні найменшага гуку, аднак прысутнасьць незразумелых прадметаў непакоіла мяне. Нарэшце я наважыўся.

Вось мая баязьлівая рука другі раз павярнула выключальнік. Кашмар, які прадвяшчаў ніжні паверх, бушаваў і квітнеў на верхнім. Там было шмат прадметаў, або некалькі прадметаў, зьвязаных між сабою. Я заўважыў нешта накшталт вялікага апэрацыйнага стала, вельмі высокага, у форме літары U, з круглымі паглыбленьнямі на канцах. Я падумаў, што гэта мог быць ложак насельніка, чыя страшлівая анатомія выяўлялася такім чынам, ускосна, як нейкай жывёліны, або нейкага бога — паводле ягонага ценю. Зь нейкае старонкі Лукана, чытанае даўно й забытае, прыйшло мне на думку слова *амфісбэна,* якое падказвала, аднак не вычэрпвала таго, што ўбачылі пасьля мае вочы. Памятаю



таксама люстэркі ў форме V, што губляліся ў вышэйшай цемры.

Якім быў насельнік дому? Што ён мог шукаць на гэтай плянэце, ня менш страшнай для яго самога, чым для нас? Зь якіх таемных рэгіёнаў астраноміі або часу, зь якога старажытнага і цяпер ужо невылічальнага сутоньня прыбыў ён у гэтую паўдзённаамэрыканскую ваколіцу і ў гэтую дакладную ноч?

Я адчуў, што няпрошана ўварваўся ў нейкую бязладную прастору. На вуліцы ўжо суняўся дождж. Я паглядзеў на гадзіньнік і пабачыў сабе на зьдзіўленьне, што была ўжо амаль другая гадзіна ночы. Я пакінуў гарэць сьвятло й пачаў асьцярожна спускацца. Спусьціцца адтуль, куды я падняўся, не было немагчыма. Спусьціцца пакуль ня вернецца насельнік. Я падумаў, што не зачыніў двое дзьвярэй, бо ня ведаў, як гэта зрабіць.

Мае ногі даткнуліся перадапошняе прыступкі лесьвіцы, калі я адчуў, як нехта падымаецца па сходах, гнятлівы, павольны і множны. Цікаўнасьць перасіліла страх, і я не заплюшчыў вочы.

Пераклаў з гішпанскай Сяргей Шупа



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



Суродзічы Беларусы!

Маю гонар і прыемнасьць вітаць вас ад імя сяброў Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады і майго асабіста, з найвялікшым нашым нацыянальным сьвятам — 77-мі ўгодкамі абвешчаньня, Актам 25 Сакавіка, Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

I хоць брутальная сіла нашых ворагаў з усходу й захаду зьнішчыла Беларускую Народную Рэспубліку, яна не магла зьнішчыць волі беларускага народу да змаганьня за незалежнасьць.

Акт 25 Сакавіка мае для нас калясальнае значэньне:

1. Актам 25 Сакавіка беларускі народ заявіў усяму сьвету сваю непахісную волю быць незалежным. I гэтым запачаткаваў у беларускім адраджэнскім руху новую эпоху — эпоху змаганьня за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі.

2. Акт 25 Сакавіка паставіў на парадку дня нявырашанае пытаньне незалежнасьці Беларусі.

3. З Актам 25 Сакавіка лічыліся й бальшавікі, калі ў 1919 годзе мусілі стварыць, хай сабе й фікцыйную, БССР. Каб не было Акту 25 Сакавіка, не было б і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, а была б толькі северо-западная вобласьць РСФСР.

4. Каб не было Акту 25 Сакавіка, не было б прадстаўніцтва Беларусі ў Задзіночаных Нацыях.

5. Не было б сяньня й Рэспублікі Беларусь.

Таму беларусы, на якім бы кантынэнце сьвету яны ні знаходзіліся — у Эўропе, Амэрыцы ці Аўстраліі — з году ў год урачыста адзначаюць найвялікшае сваё нацыянальнае сьвята — Дзень 25 Сакавіка, і дэкляруюць сваю вернасьць змаганьню за незалежнасьць Беларусі.

У дзень 25 Сакавіка міжвольна кожнаму з нас на думку прыходзіць пытаньне: а што я, маленечкая частка беларускага народу, магу й павінна рабіць, каб памагчы нашаму агульнаму змаганьню за незалежнасьць Беларусі? Адказ адзін: актыўна сьведчыць перад сьветам, скрозь і заўсёды, што я з крыві, косьці й з душы прадстаўнік беларускага народу, які, як і кожны іншы народ, мае права на поўную дзяржаўную незалежнасьць. А духовай сілай маёй ёсьць мая родная беларуская мова. Не дарма ж ворагі намагаюцца яе — нашу духовую сілу да жыцьця — зьнішчыць.

Дык жадаем вам, Дарагія Суродзічы, моцы духа, вытрываласьці, мужнасьці й мудрасьці ў нашым змаганьні за ідэалы 25 Сакавіка.

Жыве беларускі народ у змаганьні!

Жыве незалежная Беларусь!

Др. Раіса Жук-Грышкевіч
Старшыня

---

Дарагія Суродзічы!

Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі вітае Вас з знамянальнаю датаю — 77-мі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

Апошнімі часамі сілы, варожыя адраджэньню беларускай дзяржаўнасьці, намагаюцца стварыць для нашага народу ўмовы роспачы, выклікаць у людзей ня толькі пачуцьцё абыякавасьці, але й нават непрыхільнасьці да самой ідэі беларускае незалежнасьці. На вялікі жаль, гэтыя сілы знаходзяць ня толькі падтрымку сярод кіраўнікоў дзяржаўных структураў Беларусі, але гэтыя кіраўнікі часта робяцца самі зачыншчыкамі антынацыянальных, разбуральных працэсаў на нашай Бацькаўшчыне. Таму барацьба Беларусі за сваю незалежнасьць заходзіць, хаця й паволі, у крытычны стан.

Адчуваючы вялікі непакой за будучыню Беларусі, як незалежнае дзяржавы, хочацца, аднак, верыць, што выбары ў гэтак званы Вярхоўны Савет Беларусі, прызначаныя на 14-га травеня, дадуць перавагу прадстаўнікам дэмакратычнага, адраджэнскага руху, якія здолеюць спыніць антынародныя, дэструктыўныя працэсы, што адбываюцца на нашай Бацькаўшчыне.

Няхай Векапомны Акт 25-га Сакавіка згуртуе ўсіх беларусаў, як на Бацькаўшчыне, гэтак і на эміграцыі, на новую барацьбу за адраджэньне беларускае дзяржаўнасьці! Няхай паходня, запаленая 25-га сакавіка 1918 году, зырка гарыць, асьвятляючы шлях да здабыцьця поўнае незалежнасьці Беларусі!

Няхай жыве вольная, дэмакратычная Беларусь!

Расьціслаў Завістовіч
Старшыня
Міхась Сенька
Сакратар

---

«Людзі, гляньце, жавароначка!» Вы яшчэ ня бачыце яе з-за хмар? Сапраўды, цёмна стала на нашым двары.

У панядзелак цэлы дзень ляпіў і ляпіў то вялізнымі камякамі, а то сыпаў дробным парошкам мокры, зусім ужо непатрэбны нікому сьнег. Як якое насланьнё, ён быў усюды: і ў Койданаве, і ў Менску, і ў Пухавічах. А ўвечары, калі ўжо й сонца пакінула нас, сьнег, бы той дэман, усё кружыў над Беларусяй. Ён распасьцёрся пад нагамі белым кілімам і быў, здавалася, татальны, як той, хто сьцьвярджаў, што прыйшоў ён «усур'ёз і надоўга». I нават я паверыла, што прыйдзе йзноў зіма. Але ўжо назаўтра гэтая вера, як і абрыдлы сьнег, расталі зь першымі промнямі сонца.

Раніцай, шлэпаючы з малым па новаўтворанай сьцежцы да ягонага садку, я ўспамінала сваё маленства. Сьнягі — вышэй платоў, маразы — пад 30°, а мы, вясковая дзятва, ідзём у школу за 3 км па полі, нягледзячы на палёгку, зробленую школьным начальствам. Я строга дакарала сябе, што паверыла, што спужалася зімы. А пасьля прыйшла ясная, мудрая, бы зь Неба дасланая, думка. Той, суровай зімы маленства ўжо ніколі ня будзе, таму што зьмяніўся да цяплейшага клімат на ўсёй Зямлі.

Добра гэта ці дрэнна — я ня ведаю. Я толькі магу паўтарыць усьлед за маёй мамай: «Так трэба». А для атэістаў тлумачу: «Гэта воля Божая».

«Ну, а дзе ж жавароначкі?» — спытаюць нецярплівыя. О! Я іх бачыла шмат. Найперш — гэта нашыя дзеткі. Гэта мы, дарослыя пустадомкі, сваім хамствам забруджваем чыстыя душы нашых дзяцей. Пабачыўшы тое ў санаторыі, мая малая дачушка будзе роспачна і ўголас плакаць: «Мамачка, забяры мяне адсюль!» I моцна сьцісьнецца маё сэрца да жалю, і бязвольна апусьцяцца рукі. I ня знойдзецца ласкавых слоў для дзіцяці, а толькі прарыпяць, як казённыя мыліцы: «Дачушка, ты зразумей, што дарослыя бываюць неразумныя. I гэта вельмі часта бывае». А яна, мая жавароначка, усё зразумее лепей за мяне. У наступнае спатканьне яна прыйдзе да мяне спакойная, ласкавая й скажа: «Мама, калі ўсе заснуць у палаце — я малюся». А пасьля пацалуе й перахрысьціць мяне на дарогу. Хто й калі навучыў яе гэтаму?

А мой старэйшы сын расказвае, як у іхняй школе дзеці гуляюць у прэзыдэнта: «Сярожа быў Лукашэнкам, а Дзяніс з Максімам — амонаўцамі. Лукашэнка скамандаваў амонаўцам. Тыя сталі ў дзьвярох, і ўсім, хто праходзіў, давалі пстрычкі. Мне толькі адна пстрычка дасталася, і я ўцёк...» Вось якая жавароначка.

I тая, відаць, адзінокая, настаўніца-пэнсіянэрка, што гаманіла з сваім суседам па электрычцы, — яна таксама вястуньня вясны. (Я не хочу ни немцев, ни поляков, но и русских не хочу. Мы должны быть сами хозяевами.) Малады чалавек, на твары — сама дабразычлівасьць, казаў, што трэба добра працаваць кожнаму, а не чакаць падачак, і ўсё ў нас будзе. Ды людзі заленаваліся (а эти бабки, что сидят во дворах, сплетничают — они тоже хитрые. Не хотят работать. Вон бабка Шушкевича козу держала), а каб прымусіць іх працаваць, патрэбны Гітлер, вайна...

Словы сказаныя і падпісаныя нейкія пагадненьні аб згодзе і супрацоўніцтве. А кошт гэтых пагадненьняў такі самы, як кошт пакту Молатава-Рыбэнтропа...

«Людзі, гляньце, жавароначка!» Яна лётае ўжо даўно, з часоў Караткевіча. «Прыйшла, дадзена была Адзіная Любоў. I гэтае Адзінае Каханьне трэба было берагчы, нават коштам жыцьця... Як чазенія. Хай коратка, але жыць. Заваёўваць магчымасьць вышэйшай дабраты, жыцьця дзеля іншых, а не адбіраць у іх магчымасьць гэтага жыцьця».

I я ўжо ведаю, што ні ад Ельцына, ні ад Лукашэнкі не залежыць маё Адзінае Каханьне, бо яно залежыць ад мяне.

Там, у Воршы, на зьнявечанай радзіме Караткевіча, чакаюць матчынай ласкі асірацелыя пляменьнікі. Маёй ласкі. I няхай сабе мая цётка нешта казала пра рознасьць нашых культураў, а п'яны дзядзька прасьлязіўся ад майго беларускага слова, а шафёр аўтобуса казаў, што яны, аршанцы, былі б і радыя далучыцца да Расеі, але тузы ня хочуць здаваць сваіх партфэляў. Гэта ўсё было год таму назад. Гэта ўсё было даўно і няпраўда. I ў рэшце рэшт, якая мне да ўсяго гэтага справа? Ідзе вясна. Яе трэба прывітаць.

Л.Г.
Койданава

---


Кінаімпрэза
«ІТАЛЬЯНСКАЯ КІНАНЯТЛЕНКА-2»
красавік 1995 г.

2 (нядзеля)
15.30, 18.00, 20.30 М.Антаніёні «Забрыскі Пойнт»
3 (панядзелак)
18.00, 20.30 П.-П.Пазаліні «Дэкамэрон»
4 (аўторак)
17.30, 20.30 Ф.Фэліні «Джульета й духі»
10 (панядзелак)
18.00, 20.30 Ф.Фэліні «Дарога»
11 (аўторак)
18.00 Ф.Фэліні «Дарога»
20.30 Э.Скола «Агідныя, брудныя, злыя»
12 (серада)
18.00, 20.30 Э.Скола «Агідныя, брудныя, злыя»

Усё гэта адбудзецца ў «Альтэрнатыўным тэатры» (Менск, вул. Веры Харужай, 31а).
Папярэдні продаж квіткоў са скілкаю 1 красавіка (субота) з 16.00 да 18.30 (БЯЗ ЖАРТАЎ).

DES

Акцыянэрнае Таварыства «DES» (г. Магілёў) прапануе:

Узаемавыгаднае супрацоўніцтва зь дзелавымі партнэрамі з краінаў Балтыі.

Стала рэалізуем спэцвопратку, асбэстатэхнічныя вырабы, інструмэнт, падшыпнікі, усе віды беларускай мэблі, піламатэрыялы, ДСП, вату мэдыцынскую бавоўнавую.

На папярэднюю заяўку магчымыя пастаўкі плашчавых, падкладачных тканінаў, а таксама рознай прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў.
Рэспубліка Беларусь, г. Магілёў, вул. Ціміразеўская, 11
факс 23-45-36
тэл. 23-44-47


*Фундатары «НН»: К.Вініцкая (ЗША) — $30. Вялікі дзякуй!*


Беларускае радыё з Польшчы

тры разы ў дзень

8.00 на кароткіх хвалях 49,71 м
14.30 на кароткіх хвалях 41,18 і 50,04 м
16.30 на кароткіх хвалях 41,99 і 49,22 м

у праграме:

агляд тыднёвіка беларусаў Польшчы «НІВА» (панядзелак 8.00 і 14.30)

Эканамічны агляд — бізнэс, банкі, Варшаўская Акцыянэрная Біржа, курсы валютаў, эканамічнае супрацоўніцтва Польшчы й Беларусі (серада 8.00 і 14.30)

Культурныя актуальнасьці (чацьвер 8.00 і 14.30)

Навукова-тэхнічная перадача (пятніца 8.00 і 14.30)

Гутаркі Сакрата Яновіча «Ад Бібліі да беларускае літаратуры» (субота 8.00 і 14.30)

Рэлігійныя гутаркі айца Уладзімера Місеюка (нядзеля 8.00)

Беларускі літаратурны рух у Польшчы — гутарка Алеся Барскага (нядзеля 8.00 і 14.30)

Навіны з усяго сьвету, камэнтары, гутаркі, музыка.

*ЖЫВОЕ БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ*


**НАША НІВА** №3 (33) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Заснавальнік і выдавец Павал Жук. Адрасы для допісаў: 220123 Менск, а/с 71 альбо 2041 Вільня, а/с 2082. Падпісны індэкс 63125, Steigimo liudijimas Nr.1178. Рэдакцыя (Менск, Іванаўская 56 альбо Вільня, Жыгімонта 12/2): Алег Дзярновіч (адк. сакратар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар), Андрэй Антонаў (набор); пры ўдзеле Сяргея Шупы. Афсэтны друк. Фармат А3. Агульны наклад 7 тыс. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, пр. Скарыны, 79). Кошт дамоўны.
Падпісана ў друк 28.III.95 Замова 260

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010